ВАЖНЕЙ ЗА ЎСЁ... ЦЯПЛО Ў ДОМЕ 7

БЕЛАРУСКАЯ КУХНЯ МОЖА БЫЦЬ ВЫСОКАЙ... 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 ЖНІЎНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 159 (29781)

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

«Мэта ў нас адна — дапамагчы чалавеку. Мы настройваем дэпутатаў, каб яны не проста фармальна праводзілі прыёмы грамадзян, каб вырашалі не толькі прыватныя пытанні жыхароў, але і рэгіянальныя праблемы. Гэта вельмі важна. Тым больш што цяпер у нас разам з урадам ідзе работа над праектам бюджэту на наступны год. І мы можам нейкія моманты ўлічыць, унесці карэктывы, каб сапраўды зняць праблемныя пытанні ў тым ці іншым рэгіёне. Ніводзін зварот грамадзян не застаецца без увагі. Заўсёды складаецца пратакол даручэнняў і кожны зварот бярэцца на кантроль».

Хлеб на дваіх

У гаспадарцы «Маяк Браслаўскі», якая ў раёне лідзіруе на жніве, завяршаецца абмалот азімых. На палетках гаспадаркі сёлета засеялі азімых збожжавых культур дзве тысячы шэсцьсот гектараў і тысячу семсот гектараў яравых. Асабліва радуе хлебаробаў ураджай пшаніцы, бо на гектарны круг культура дае сорак два цэнтнеры. Сярод камбайнераў, дзякуючы якім гаспадарка лідзіруе на нялёгкай хлебнай ніве, трактарысты-браты Міхаіл і Віктар ВАЙТАНЦЫ (*на здымку*). Сёлета яны таксама ў ліку лідараў жніва не толькі сваёй гаспадаркі, але і раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАРАТКА

- **У Беларусі створана дарожная карта па павышэнні якасці школьных падручнікаў.**
- Беларускія археолагі знайшлі асабісты радавы знак полацкага князя Ізяслава на фрагменце посуду.
- **У БДУІР з'явіўся факультэт інфармацыйнай бяспекі.**
- На праграме «Сямейны капітал» адкрыта больш за 116 тысяч дэпазітаў.
- **Беларуская дэлегацыя ўдзельнічае ў міжнародным ваенна-тэхнічным форуме «Армія-2022».**
- Другі этап «Ганненскага кірмашу» пройдзе ў Зэльве 19—20 жніўня.
- **Моладзь і вучоныя пачалі сумесныя археалагічныя раскопкі гарадзішча «Менка».**

Героі жніва

З УРАДЖАЕМ І ПЕСНЯЙ

Земляробы Столінскага раёна першымі ў краіне адсвяткавалі дажынкі

На Століншчыне ніколі не забывалі спрадвечную палескую традыцыю: пасля таго як зжынаці апошні сноп, ішлі на бяседу, каб з песняй і свежым каравае адзначыць свята ўраджаю. Гэтым разам хлебаробы раёна яшчэ ў сераду першымі не толькі ў вобласці, але і ў краіне скончылі ўборку збожжавых, а ў мінулую нядзелю ў аграгарадку Кароцічы справілі свята.

СТАР. 4

На слыху

ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ: ХТО ШТУРМАВАЎ ВНУ?

У БДУ 82 % залічаных на першы курс набралі 300 балаў і больш

Фота bsmu.by

10 жніўня ўступная кампанія ў беларускіх ВНУ выйшла на фініш. Начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ ацаніў яе як паспяховую і для абітурыентаў, і для патэнцыяльных заказчыкаў кадраў.

СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЧАС ПРЫМАЦЬ КАРДЫНАЛЬНЫЯ МЕРЫ, ПАЧЫНАЮЧЫ З ГАЗПРАМАЎСКІХ ПРАЕКТАЎ І ЗАКАНЧВАЮЧЫ БУДАЎНІЦТВАМ ЖЫЛЛЯ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў пляцоўку комплекснай рэканструкцыі забудовы Мінскага гарадскога тэхнапарка, якая размяшчаецца на тэрыторыі Мотавелазавода. Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з ходам рэканструкцыі пляцоўкі. У сувязі з гэтым была абмеркавана і глабальная тэма — завяршэнне будаўніцтва праблемных аб'ектаў у Мінску. Таксама Прэзідэнт азнаёміўся з работой мотавелазавода, заслухаў даклад аб рабоце прадпрыемства і перспектывах яго развіцця.

Аляксандр Лукашэнка наведваў мотавелазавод у сакавіку 2021 года. Тады ён падкрэсліў, што на гэтых тэрыторыях павінна быць высокатэхналагічнае прадпрыемства. Значная частка тэрыторый мотавела не выкарыстоўвалася, частка пабудоў патрабавала сур'ёзнай рэканструкцыі, а некаторыя будынкі ўвогуле трэба было зносіць. Як варыянт выкарыстання гэтай тэрыторыі абмяркоўвалася размяшчэнне тут Мінскага гарадскога тэхнапарка. У сакавіку 2021 года Прэзідэнт арыентаваў зрабіць тут узорны тэхнапарк і па яго прыкладзе развіваць у іншых гарадах і месцах. «У цэнтры горада мы захаваем гэту пляцоўку як вытворчую, але чыстую. Тут не будзе ні ліцця, ніякіх нафтапрадуктаў — чыстая пляцоўка. І другая асаблівасць гэтай пляцоўкі тэхнапарка ў тым, што гэта будзе выключна вытворчасць. Ніякіх пасярэднікаў і нават ніякага гандлю, за выключэннем толькі, калі тут будуць базіравацца людзі для гандлю прадукцыяй на экспарт», — гаварыў Аляксандр Лукашэнка. Тады ж ён даў і адпаведныя даручэнні наконт развіцця самога мотавелазавода.

У жніўні 2022-га Прэзідэнту далажылі, як ідзе работа над рэканструкцыяй пляцоўкі праз год пасля яго візіту. Аднак кіраўнік дзяржавы выказаў шэраг нараканняў наконт аператыўнасці работ. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў дзейнічаць больш актыўна. **Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ** далажыў аб работах па зносе непрыдатных будынкаў і збудаванняў, будаўніцтве новых карпусоў і выдзяленні іх у арэнду для вытворцаў. Прэзідэнт на аўтобусе здзейсніў аглядную паездку па тэрыторыі пляцоўкі, падчас якой дэталёва пацікавіўся ходам работ і даў шэраг даручэнняў.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў, каб да новага года работы па новых памяшканнях вяліся ўжо на падмурках. «Мы павінны будаваць па-сучаснаму. Не цагляны мур у паўметра, а самыя сучасныя сценавыя панэлі», — даручыў ён. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на недапушчальнасці крадзяжоў: «Не дай Бог, тут будзе скрадзены хоць адзін рубель». Прэзідэнт даручыў з такімі ж падыходамі працаваць і на іншых мінскіх пляцоўках, якія цяпер не выкарыстоўваюцца. Яго асноўнае патрабаванне — рабіць усё гэта хутка. Аляксандр Лукашэнка асобна звярнуў увагу на захаванне гістарычнага аблічча будынка на Партызанскім праспекце, які фарміруе ансамбль усяго праспекта.

МЫ ПАВІННЫ РАБІЦЬ СВАЁ

Прэзідэнт наведаў і адзін з вытворчых цэхаў мотавелазавода. Ён звярнуў увагу, што многія камплектуючыя цяпер закупляюцца за мяжой, але, па словах кіраўніка дзяржавы, трэба імкнуцца да таго, каб рабіць сваё. Напрыклад, па асобных вырабах лакалізацыя толькі каля 20 %. Ва ўмовах цяперашняга становішча ў свеце, санкцыйнага ціску такі падыход нясе пэўныя рызыкі. «Мы павінны рабіць сваё! Тое, што завёз запчасткі, сабраў тут... Добра, з кітайцамі (камплектуючыя мотавелазавод закупляе ў Кітаі. — **Зв.**) у нас добрыя адносіны. Гэта павінна быць сваё, накольки магчыма. І так па ўсіх матацыклах і веласіпедах», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы застаўся незадаволеным убачаным на заводзе. Ён адзначыў марудную рэалізацыю раней намечаных планаў. У сувязі з гэтым прагучала крытыка адказных асоб: «Няма чаго глядзець. Гэта не работа! Гэта работа нікому не патрэбна».

ПОМНІКІ НАШАЙ БЕЗГАСПАДАРЧАСЦІ

Падчас наведвання мотавелазавода Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, асноўным пытаннем якой стала развіццё інфраструктуры ў сталіцы і будаўніцтва новых аб'ектаў. Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што размова пойдзе аб будаўніцтве з выкананнем усіх стандартаў і абавязацельстваў. «Не трэба нагадваць, што Мінск з'яўляецца візітоўкай. Шмат робіцца для яго добраўпарадкавання, для камфорту людзей. Гэта бачаць госці сталіцы, бачаць беларусы. Але як у такую канцэпцыю прыгожага і ўтульнага горада ўпісваюцца даўгабуды? Вось асноўнае пытанне», — звярнуў увагу кіраўнік краіны.

Ён падкрэсліў, што будаўнічыя праекты не рэалізуюцца гадамі. Аляксандр Лукашэнка прывёў адпаведныя прыклады, сярод якіх аб'екты былога Мінскага вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі (МВАВТ). Толькі пасля ўмяшання Прэзідэнта давялі да розуму аб'ект на выездзе з горада па праспекце Пераможцаў. Па словах кіраўніка дзяржавы, ён такі не адзін. Ён успомніў газпрамаўскі даўгабуд. «Доўгі час не могуць увесці ў эксплуатацыю гасцініцу насупраць «Мінск-Арэны». Не завершана будаўніцтва паркінга і ўбудаваных памяшканняў у жылым доме на Нёманскай, 80. На Кальварыйскай гандлёвы цэнтр «Гулівер» — нямы дакор нашай безгаспадарлівасці. Таксама як і будынак каля цырка ў самым знакавым месцы Мінска», — пералічыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар задаў рытарычные пытанне: пра што сведчаць гэтыя прыклады? Пра тое, што ў сталіцы бардаку больш, чым дзе-небудзь, заявіў ён. «Жулікаў хапае. Але і непаваротлівасць гарадскіх чыноўнікаў таксама мае месца. Вы як ніхто павінны разумець, што гэта не толькі помнікі безгаспадарчасці. Найперш гэта нясвараныя працоўныя месцы, недаатрыманыя падаткі ў бюджэт, замарожаная эканамічная актыўнасць. Такі стан спраў нікуды не варты. Ёсць старшыня гарвыканкама, упаўнаважаныя па горадзе і аж цэлы памочнік. Час прымаць кардынальныя меры, пачынаючы з газпрамаўскіх праектаў і заканчваючы будаўніцтвам жылля», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнту далажылі аб сітуацыі з завяршэннем будаўніцтва аб'ектаў на месцы былога завода МВАВТ, перспектывах развіцця тэрыторый мотавелазавода і шляхах вырашэння праблемы ў гэтых даўгабудах сталіцы.

Фота Бел ТА.

У тэму

Па выніках наведвання Прэзідэнтам пляцоўкі забудовы Мінскага гарадскога тэхнапарка і нарады, прысвечанай сталічным даўгабудам, журналістам расказалі, як будуць выкананы даручэнні кіраўніка дзяржавы і вырашаны ўсе праблемныя пытанні.

Уладзімір КУХАРАЎ:

«Увесь комплекс работ трэба завяршыць у 2025 годзе»

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў расказаў, як зменіцца аблічча сталіцы пасля рэалізацыі ўсіх праектаў. Падчас нарады Прэзідэнт запатрабаваў узмацніць работу і завяршыць усё да 2025 года. Першапачатковы дэдлайн — 2028 год, але кіраўніка дзяржавы такі тэрмін не задаволіў. «Прэзідэнт абазначыў шэраг праблемных аб'ектаў, якія сапраўды ў Мінску існуюць. Адзін з такіх аб'ектаў знаходзіцца ў межах вуліц Я. Коласа, В. Харужай, Кульман. Гэта былыя аб'екты Мінскага вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі (МВАВТ). Рэканструкцыя вядзецца, але тэмпы недастатковыя, на што і ўказаў кіраўнік дзяржавы», — расказаў Уладзімір Кухараў. Старшыня Мінгарвыканкама адзначыў, што неабходна дапрацаваць канцэпцыю, у адпаведнасці з якой цэнтр горада будзе ўпрыгожаннем сталіцы, а аблічча будынкаў будзе адпавядаць заяўленым патрабаванням. Зрабіць гэта неабходна да 1 кастрычніка. «Таксама ў забудоўшчыка ёсць планы ўзвесці будынак сучаснага выгляду са шкла і бетону. Але на нарадзе прагучала дакладнае патрабаванне: увесь комплекс работ завяршыць у 2025 годзе. З боку інвестара зараз патрэбна забеспячэнне фінансаваннем. Як толькі будуць вырашаны гэтыя пытанні, нашы падрадныя арганізацыі ў найкарацейшыя тэрміны могуць пабудаваць будынак любой складанасці», — сказаў ён. Таксама Уладзімір Кухараў заўважыў, што нічога новага ў цэнтры сталіцы будаваць уже не трэба, бо горад сфарміраваны. Любы будынак будзе ўплываць на агульнае архітэктурнае аблічча. Але ёсць тое, што падлягае рэканструкцыі, яе трэба праводзіць.

Прэзідэнту таксама далажылі планы на рэканструкцыю тэрыторыі мотавелазавода. Кіраўнік дзяржавы таксама запатрабаваў завяршыць гэта ў хуткім часе. «Статус тэхнапарка гаворыць аб тым, што там выпускаюць імпартазамяшчальную інавацыйную прадукцыю. Так што тут будуць працаваць толькі тыя, хто падпадае пад гэтыя крытэрыі. Карпусы ўжо распісаны, ёсць вытворцы, якія іх зоймуць і будуць вырабляць сельгасабсталяванне, медабсталяванне і іншае. Мы пастараемся аблічча мотавелазавода з цагляным мурам максімальна пакінуць», — расказаў Уладзімір Кухараў.

Уладзімір ДАВІДОВІЧ:

«Мінскі гарадскі тэхнапарк на новай пляцоўцы пачне працаваць у 2023 годзе»

Дырэктар Мінскага гарадскога тэхнапарка Уладзімір Давідовіч анансаваў дату пачатку работы парка на новай пляцоўцы. На тэрыторыі мотавелазавода тэхнапарк адкрые свае дзверы 1 студзеня 2023 года. Цяпер вытворчыя памяшканні Мінскага гарадскога тэхнапарка размешчаны на вуліцы Солтыса. Неўзабаве ў яго з'явіцца дадатковая пляцоўка — будаўнічыя работы вядуцца на былых тэрыторыях мотавелазавода. Прэзідэнт даручыў весці гэтыя работы больш актыўна.

«Паступова будаўнікі будуць адыходзіць, пакідаючы вытворчыя памяшканні, якія ўсё больш і больш будуць напаўняцца вытворчымі кампаніямі. Чым больш паспяхова яны будуць развівацца, тым больш паспяхова будзе развівацца Мінск і ў цэлым краіна», — сказаў дырэктар МГТ. На пляцоўцы тэхнапарка размесцяцца кампаніі па вырабе лёгкіх стальных канструкцый, вытворчасці вакуумных печак і абсталявання для перапрацоўкі алейных культур. Уладзімір Давідовіч запрасіў вытворчыя кампаніі, якія распрацоўваюць або выпускаюць высокатэхналагічную прадукцыю, стаць рэзідэнтамі МГТ. Для такіх прадпрыемстваў тут прадугледжаны асаблівыя льготы.

Мікалай ЛАДУЦЬКА:

«Стаіць задача выпуску беларускай тэхнікі з высокай назвай «Мінск» і «Аист»

Дырэктар ТАА «МотаВелаЗавод» Мікалай Ладуцька расказаў, як будзе вырашацца задача па павелічэнні лакалізацыі ў вытворчасці мота- і велатэхнікі. Гэта таксама адна з задач, якую паставіў Прэзідэнт. «Стаяла і стаіць пытанне выпуску не проста веласіпеда або матацыкла з імпартных камплектуючых, а беларускай тэхнікі, якая па праве мае высокую назву «Мінск» і «Аист». За апошні год распрацавана праграма мадэрнізацыі завода, у аснове якой — набыццё 120 адзінак новага тэхналагічнага абсталявання, у тым ліку для аснашчэння цэха металаапрацоўкі. Гэта дасць магчымасць пашырыць асартымент металічных канструкцый для вела- і мотатэхнікі, і для фарбавальнага цэха», — расказаў ён. Падчас наведвання прадпрыемства Прэзідэнт жорстка крытыкаваў за тое, што яго даручэнне па павелічэнні лакалізацыі вытворчасці выконваецца вельмі марудна.

«Да 1 студзеня 2023 года кіраўніцтва мотавелазавода разам з Міністэрствам прамысловасці павінны падрабязна вывучыць магчымасці вытворчасці на айчынных прадпрыемствах вузлоў, механізмаў і камплектуючых для мота- і велатэхнікі. Будуць таксама вывучаны магчымасці кааперацыі ў гэтай сферы з расійскімі вытворцамі», — растлумачыў Мікалай Ладуцька.

Па словах дырэктара Мікалая Ладуцькі, вынікам работы па мадэрнізацыі прадпрыемства і павелічэнні лакалізацыі павінны стаць добрыя фінансава-эканамічныя паказчыкі, рост экспартных паставак і продаж на ўнутраным рынку толькі 30 працэнтаў ад вырабленага.

Валерыя СЦЯЦКО.

Гучная справа

МЭТА ЗМОВЫ — ЗАХОП УЛАДЫ

Абвінавачаны па крымінальнай справе аб змове з мэтай захопу ўлады Юрый Зянковіч перадаваў распрацаваны для забойства Прэзідэнта план Мікалаю Аўтуховічу, паведамляе БелТА.

Пасяджэнне па дадзенай справе распачалося 29 ліпеня. Справу разглядае Мінскі абласны суд. Спачатку яна слухалася ў закрытым рэжыме, пасля яе працягнулі ў адкрытым. Па крымінальнай справе ў якасці абвінавачаных прыцягнуты пяць чалавек: Юрый Зянковіч, Аляксандр Фядута, Рыгор Кастусёў, Вольга Галубовіч і Дзяніс Краўчук. Юрый Зянковіч абвінавачваецца ва ўчыненні злачынстваў, прадугледжаных ч. 1 арт. 357 (змова, учыненая з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам), ч.1 арт. 361-1 (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання і кіраўніцтва такім фарміраваннем), ч. 3 арт. 361 (публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады, здзяйсненне іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, распаўсюджванне матэрыялаў, якія змяшчаюць такія заклікі, зробленых з выкарыстаннем глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт), ч. 3 арт. 130 (распальванне сацыяльнай варожасці па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці, учыненае групай асоб) Крымінальнага кодэкса Беларусі.

Аляксандр Фядута і Рыгор Кастусёў абвінавачваюцца ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага ч. 1 арт. 357 (змова, здзейсненая з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам) КК. Вольга Галубовіч і Дзяніс Краўчук абвінавачваюцца ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных ч. 1 арт. 342 (актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак і спалучаныя з яўным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады, якія пацягнулі парушэнне работы транспарту, прадпрыемстваў, устаноў або арганізацый, пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства) Крымінальнага кодэкса Беларусі.

Падчас судовага пасяджэння Юрый Зянковіч прызнаў, што з'яўляецца праціўнікам дзеючай у Беларусі ўлады. Ён не стаў аспрэчваць карыслівыя матывы, якія заахвоцілі яго да ўдзелу ў змове з мэтай захопу ўлады. Акрамя таго, абвінавачанаму інкрымінавалі ўчыненне злачынства з мэтай аблегчыць учыненне іншага злачынства — змовы з мэтай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам. Для гэтага Юрый Зянковіч стварыў экстрэмісцкае фарміраванне, заклікаў да захопу ўлады і распальваў варожасць. Яму задалі пытанне, ці дапускаў ён ахвяры сярод цывільнага насельніцтва дзеля рэалізацыі сваіх дзеянняў. Па словах Зянковіча, гэта самая апошняя мера, але верагоднасць ахвяр сярод грамадзянскіх асоб ён дапускаў. Паводле яго слоў, план пад назвай «Цішыня», мэтай якога было забойства Прэзідэнта Беларусі, быў распрацаваны Дзянісам «Дысам» Хофманам. План быў перададзены Юрыю Зянковічу, а выканаўцам павінен быў стаць Мікалай Аўтуховіч.

Тым часам у Гродне працягваецца судовы працэс па справе групы Мікалая Аўтуховіча. У крымінальнай справе больш за 65 тамоў матэрыялаў. На лаве падсудных знаходзяцца 12 чалавек. Мікалай Аўтуховіч абвінавачваецца па 12 артыкулах Крымінальнага кодэкса, 6 з іх — за асабліва цяжкія злачынствы, адзін з саставаў прадугледжвае вышэйшую меру пакарання (расстрэл або пажыццёвае пазбаўленне волі). Судовы працэс вядзе Гродзенскі абласны суд.

Падчас зум-канферэнцыі Аляксандр Фядута ўдзельнічаў у абмеркаванні рэалізацыі планаў змовы, гэта значыць сілавой змены ўлады ў Рэспубліцы Беларусь. У якасці магчымых сцэнарыяў рэалізацыі плана змоўшчыкаў ён і іншыя прыводзілі прыклады лёсаў кіраўнікоў дзяржаў іншых краін, якіх зверглі сілавым шляхам і нават забілі. Фядута прыводзіў прыклад з забойствам Прэзідэнта Егіпта Анвара ас-Садата, забітага на парадзе ў 1981 годзе. Таксама пры абмеркаванні лёсу Прэзідэнта Беларусі, фінансаванні і рэалізацыі пераварота ўдзельнікі прасілі Зянковіча як арганізатара, каб Фядута і Кастусёў пакідалі зум пры абмеркаванні такіх пытанняў у мэтах іх бяспекі, бо яны знаходзіліся ў Рэспубліцы Беларусь і разумелі, што гэта злачынства. Фядута таксама падчас допыту адзначыў, што яны дапускалі ў выніку сваіх дзеянняў магчымасць надыходу крывавых наступстваў, грамадзянскай вайны і гэтак далей. Гэта значыць ён усведамляў наступствы ў поўнай меры, нават ставіўся да лёсаў звычайных людзей абыякава.

Аляксандр Фядута заявіў, што ніхто з падсудных не адмаўляе сапраўднасці прадстаўленых відэа-, фота- і аўдыёзапісаў па справе. Паводле яго слоў, агульная працягласць матэрыялаў складае каля 20 гадзін. Ён хадайнічаў звяртацца да матэрыялаў толькі ў выпадку неабходнасці. У прыватнасці, суду было прадэманстравана відэа, на якім абвінавачаны Юрый Зянковіч у рэстаране абмяркоўвае змену дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам. Абвінавачанне зачытала стэнаграму гутаркі, дзе ён расказвае пра ўзброеныя атрады і склады са зброяй, якая збіралася на працягу некалькіх гадоў для сілавога захопу ўлады. Ён казаў аб падтрымцы з боку некаторых заходніх дзяржаў і адзначаў, што ў яго ёсць знаёмыя сілавікі ў ЗША.

Па словах Рамана Пратасевіча, якога дапыталі ў якасці сведкі па справе аб змове з мэтай захопу ўлады, абвінавачаныя прынялі рашэнне аб сілавым захопе ўлады, паколькі былі ўпэўненыя, што ніякіх іншых спосабаў змяніць уладу не засталося. «Розныя маршы і хаджэнні цалкам праваліліся. Яны бачылі варыянт у сілавым зваржэнні з удзелам арміі», — заўважыў Раман Пратасевіч.

Юрый Зянковіч выношваў задуму стварыць у Беларусі протаўрад і выбрацца прэзідэнтам. Ён звяртаўся па фінансавую дапамогу да Святланы Ціханоўскай. У прадэманстраванай на пасяджэнні перапісцы абвінавачаны скардзіўся на фінансавыя праблемы. Акрамя таго, абмяркоўваліся думкі па праекце Канстытуцыі. Некаторыя раздзелы прапаноўвалася адмяніць на пераходны перыяд, нешта прапаноўвалася дапоўніць. Ішла гаворка і пра ўсеагульную амністыю. На працягу 30-60 дзён пасля дня ікс прапаноўвалася вынесці новы праект Канстытуцыі на рэферэндум. У перапісцы Юрыя Зянковіча за студзень 2021 года ў чарговы раз агучвалася неабходнасць сілавога рашэння і агульнанацыянальнага дыялогу па трох пунктах: адстаўка дзеючага Прэзідэнта Беларусі, новыя выбары і вызваленне палітвязняў. На прадэманстраваным у судзе аўдыёзапісе Зянковіч заяўляў суразмоўніку, што ўдзельнікі злачыннай групы хочуць улады, а грошы не маюць вырашальнага значэння.

У судзе працягваецца вывучэнне рэчавых доказаў. Пасля прагледжанага фрагменту адной з зум-канферэнцый дзяржаўны абвінаваўца апытаў абвінавачанага Рыгора Кастусёва. Па словах абвінавачанага, ён не прысутнічаў на канферэнцыі на працягу ўсяго часу яе правядзення і падключаўся толькі час ад часу. Тым не менш, паводле прадэманстраваных судом фрагментаў відэазапісу, Рыгор Кастусёў браў актыўны ўдзел у абмеркаванні і ў цэлым разумеў, пра што ідзе гаворка. У прыватнасці, абвінавачаны наракаў на тое, што фінансаванне размяркоўваецца нераўнамерна. Паводле яго слоў, значная частка сродкаў, што выдзяляюцца на дзяржаўны пераварот, застаецца ў тых беларусаў, якія знаходзяцца за мяжой. Да беларусаў, якія жывуць у сваёй краіне, адзначыў Рыгор Кастусёў, даходзіць не больш за 10 % фінансаў. Разам з тым, згадвалася праблема з недахопам фінансавання. Па словах удзельнікаў, яны разлічвалі, што сродкі могуць выдзеліць ЗША ці Еўропа.

Пётр ДУНЬКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

НАТА накіруе каля 2,4 тысячы амерыканскіх салдат у Еўропу

Паўночнаатлантычны альянс накіруе каля 2,4 тысячы амерыканскіх вайскоўцаў у Балгарыю, Венгрыю, Румынію і Славакію для ўзмацнення ваеннай прысутнасці ў Еўропе. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на «Твітэр» НАТА. У пасце адзначаецца, што вайскоўцы з 101-й паветрана-дэсантнай дывізіі ЗША будуць накіраваны ў краіны Еўропы для абароны ўсходняй граніцы НАТА і ўмацавання сіл саюзнікаў. Як вядома, раней усходні фланг Паўночнаатлантычнага альянсу папрасіў ЗША паскорыць пастаўку ўзбраення і нарасціць прысутнасць вайскоўцаў на іх тэрыторыі, паведаміла PIA «Навіны» са спасылкай на The Washington Post. Амерыканскі прэзідэнт Джо Байдэн на саміце НАТА ў Мадрыдзе аб'явіў аб планах далейшага нарошчвання амерыканскай ваеннай прысутнасці ў Еўропе.

У Каіры пры пажары ў царкве загінулі больш за 40 чалавек, у тым ліку 15 дзяцей



У егіпецкай сталіцы падчас ранішняй службы адбыўся пажар у праваслаўнай царкве Абу-Сейфайн у рабочым раёне Імбаба. У выніку 41 чалавек загінуў, сярод іх 15 дзяцей, 16 пацярпелі, паведаміла Associated Press. Паводле інфармацыі мясцовых улад, у момант пажару ў храме знаходзілася каля пяці тысяч чалавек. Большасць людзей загінула ў цісканіне, калі спрабавалі выбрацца з царквы, а ўваход быў заблакіраваны агнём. Прычынай пажару стала ўзгаранне кандыцыянера на другім паверсе рэлігійнага будынка ў выніку няспраўнасці электраправодкі. Пра гэта паведаміла міністэрства ўнутраных спраў краіны, якое курыруе ўпраўленне грамадзянскай абароны.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў шчырае спачуванне Прэзідэнту Егіпта Абдэль Фатаху аль-Сісі ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі ў выніку пажару ў храме ў Каіры.

Эксперты СААЗ далі новыя назвы двум варыянтам віруса воспы малпаў

Спецыялісты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ўзгаднілі новыя найменні двух варыянтаў віруса воспы малпаў. Цэнтральнаафрыканская клада (разнавіднасць) гэтага віруса будзе называцца «клада I», а заходнеафрыканская — «клада II». Такую інфармацыю паведаміла ТАСС са спасылкай на прэс-службу СААЗ. Як адзначылі ў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, мэта такой дзейнасці — «пазбягаць прычынення абраз якім-небудзь культурным, грамадскім, нацыянальным, рэгіянальным, прафесійным або этнічным групам», зменшыць любы адмоўны ўплыў на гандаль, падарожжы, турызм або жывёльны свет. Экспертныя абмеркаванні аб новых назвах віруса яшчэ не скончыліся. Навуковая група «дасягнула кансэнсусу аб новай наменклатуры клад віруса».

Спякота і дажджы з навальніцамі

Спякота да 32 градусаў і дажджы з навальніцамі чакаюцца ў Беларусі на гэтым тыдні, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

«Паступленне вельмі цёплых паветраных мас з поўдня Еўропы стала прычынай гарачага надвор'я на тэрыторыі Беларусі. У выхадныя дні тэмпературны фон па краіне павысіўся, і на сярэдзіну дня слупкі тэрмометраў паказалі плюс 26—31, што на 1—6 градусаў вышэй за кліматычную норму. На будучым тыдні надвор'е застанецца такім жа. У большасці раёнаў краіны захаваецца спякота, прычым у начны час тэмпература паветра не апусціцца ніжэй за плюс 14—21, на сярэдзіну дня слупкі тэрмометраў пакажуць 25—32 градусы спякоты, толькі ў дзённыя гадзіны 17 жніўня месцамі тэмпература паветра не падымецца вышэй за плюс 23—24», — расказалі ў Белгідрамеце.

Не абыдзецца без лакальных дажджоў. Яны будуць мець кароткачасовы характар і месцамі суправаджацца навальніцамі.

У аўторак, 16 жніўня, месцамі, а днём па захадзе на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 15—21 градус вышэй за нуль, днём — плюс 26—31.

У сераду, 17 жніўня, месцамі па Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 14—20 градусаў цяпла, днём — плюс 23—30.

У чацвер, 18 жніўня, будзе пераважна без ападкаў, толькі ноччу па паўднёвым усходзе, днём у паўднёвых раёнах краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 14—20, днём будзе 26—31 градус спякоты.

У пятніцу, 19 жніўня, ноччу па паўднёвым усходзе, днём у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 14—20 градусаў вышэй за нуль, днём — плюс 26—32.

Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, у выхадныя дні з тэрыторыі Польшчы да заходніх рэгіёнаў Беларусі наблізіцца франтальная сістэма, якая абумовіць на большай частцы тэрыторыі краіны дажджы рознай інтэнсіўнасці, пры развіцці воблачнасці месцамі дажджы будуць суправаджацца навальніцамі. «Уплыў атмасфернага фронту, які перамяшчаецца праз тэрыторыю Беларусі, захаваецца і ў нядзелю, 21 жніўня. Пры гэтым тэмпературны фон па краіне панізіцца і наблізіцца да сваёй кліматычнай нормы», — адзначылі ў Белгідрамеце.

У суботу, 20 жніўня, ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 14—20 градусаў вышэй за нуль, днём — плюс 25—32.

У нядзелю, 21 жніўня, на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 13—19 градусаў вышэй за нуль. Днём будзе 20—27 градусаў цяпла, месцамі — да плюс 29.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне Андрэю Міхайлавічу Кунцэвічу, першаму намесніку міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь, з прычыны вялікага гора, якое яго напаткала, — смерці БАЦЬКІ.

Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні першаму намесніку міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Андрэю Міхайлавічу Кунцэвічу ў сувязі з вялікім горам, якое яго напаткала, — смерцю БАЦЬКІ.

З УРАДЖАЕМ І ПЕСНЯЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Былі на тым фестывалі працаўнікоў вёскі песні і танцы, былі ўзнагароды і падарункі. Яшчэ па дарозе на свята ўдзельнікі «падсілкоўваліся» дажыначным настроем: наўкола стаялі самыя розныя саламяныя фігуры. Нават конкурс на найлепшы выраб з саломы быў аб'яўлены напярэдадні. А першы знак павагі і пашаны ад усіх удзельнікаў — земляробаў, кіраўнікоў раёна, гасцей, прадстаўнікоў грамадскасці — быў аддадзены абаронцам Радзімы. Да помніка землякам, якія загінулі на палях Вялікай Айчыннай вайны, усклалі кветкі.

Затым накіраваліся да галоўнай пляцоўкі мерапрыемства, каб аддаць належнае віноўнікам урачыстасці. Узнагароды атрымалі камбайнеры і кіроўцы, спецыялісты гаспадарак, іх кіраўнікі. Вядома, першыя ўдзячныя словы і першыя ўзнагароды атрымалі камбайнеры: тыя, хто працаваў у складзе 99 экіпажаў ад цямна да цямна, хто ў сціслыя тэрміны і без страт сабраў вырашчанае.

— У гэтым годзе з рэкордным для сябе намалотам рашён першым у вобласці скончыў уборку збожжавых і зернебабовых, сабрана больш за 101 тысячу тон збожжа, — адзначыў **старшыня райвыканкама Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ.** Ураджайнасць у раёне таксама даволі высокая — намалацілі 48,5 цэнтнера з кожнага гектара, што на 8,4 цэнтнера больш за леташні паказчык.

Старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ перадаў падзяку земляробам раёна ад імя ўсіх жыхароў вобласці і адзначыў іх важкі ўклад у харчовую бяспеку краіны.

Адзін за адным на сцэну для атрымання ўзнагарод узняліся 75 чалавек. З перамогай у спаборніцтве вяншавалі экіпаж Ілы і Юрыя Неўдахаў з КСУП «Відзіборскі». Механізатары ў раёне вядомыя, яны ўжо не раз

Фота Аляксандра НІКІФАРЭНКІ.

адзначаліся і на ўзроўні вобласці. Таксама высокія вынікі і такое ж майстэрства паказалі камбайнеры з СВК «Фядорскі» — экіпажы Пятра і Сяргея Платніцкіх, Леаніда Свірскага і Рыгора Лясько, Уладзіміра Шувалава і Дзмітрыя Багаткі. Першым сярод найлепшых кіроўцаў назвалі Рыгора Юнкевіча з гаспадаркі «Прыпяць-2009», які хутка і якасна дастаўляў збожжа да пункта перапрацоўкі.

Не абышлося, вядома, без ушанавання гаспадарак, якія паказалі найлепшыя вынікі ў справе вырошчвання хлеба. Першае месца па выніках спаборніцтва аказалася ў сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Рубельскае», якое, дарэчы, заснаваў фермер Аляксей Кобец. Другое і трэцяе месцы занялі адпаведна — КУПП «Манькавічы» і КСУП «Відзіборскі».

Асаблівай адзнакі на гэты раз удастоена і СВК «Фядорскі». Тутэйшыя механізатары першымі справіліся са сваім жнівом і пяцюю экіпажамі накіраваліся на дапамогу ў гаспадаркі свайго і суседніх раёнаў.

Пасля афіцыйнай часткі фестываль працягваўся на розных пляцоўках. Было многа добрых усмешак і сустрэч. Шмат гледачоў сабралі выставы дажыначных снапоў і сельскагаспадарчай тэхнікі. Камбайны стаялі прыгожа прыбраныя: ну чым не героі жніва? Працавалі выстава твораў рамеснікаў, выязны гандаль. Настрой стваралі самадзейныя артысты. Дарэчы, на ўрачыстай частцы фестывалю дыпломамі былі адзначаны і работнікі культуры, прафсаюзныя актывісты. За што? За тое, што падчас уборачнай з поля не вылазілі, падбадзёрвалі хлебаробаў песняй і словам.

Ну і гаспадары дажынак выглядалі на свяце вельмі дастойна. ААТ «Кароцічы» адзначылася рэкордным ураджаем: больш за 60 цэнтнераў збожжа атрымалі тут з гектара. Не соромна гасцей прымаць, калі гаспадары заможныя.

Яна СВЕТАВА.

КАЛІ КОСІШ, І ДУША РАДУЕЦЦА...

У вёсцы Высокае Бярозаўскага раёна прайшоў аграэкафестываль «Спораўскія сенакосы»

Пятнаццаты раз сабраліся ў мінулую суботу на спораўскіх балотах аматары традыцыйнай касьбы. Аграэкафестываль «Спораўскія сенакосы» склікаў каманды ўмельцаў ручнога кашэння на балоце. Падцягваліся гледачы. Яно і зразумела: касьба ўручную становіцца экзотыкай нават у сельскай мясцовасці — у эпоху суцэльнай камп'ютарызацыі жывёлагадоўлі і магутнай тэхнікі на палях.

Але якая б сучасная тэхніка ні прыходзіла на падмогу чалавеку, ёсць мясціны ў балотах, якія можна падтрымліваць у парадку толькі з дапамогай дзедавай касы. Пра гэта заўсёды нагадваюць спецыялісты заказніка «Спораўскі», створанага менавіта для захавання аднаго з нашых галоўных багацяў — балота.

Разгаварыліся з вясковымі пенсіянеркамі. «Хто б мог падумаць, — разважаюць жанчыны, — што наша балота стане сапраўднай славутасцю! Мы яго некалі ледзь не пракліналі, калі даводзілася сена вывозіць на лодцы альбо ставіць у стажкі і чакаць марозу». Адна з іх успомніла, як у 1960-я гады выдалася дажджлівае лета, і па балоце разлілася вада. Тады кожны свае копы вывозіў на лодцы, а на падворку сена сушылі яшчэ раз. Касьба на балоце была адзіным спосабам назапасіць корм для ўласнай каровы. Цяпер, паводле іх слоў, людзі гора не ведаюць — з кармамі дапаможа гаспадарка, толькі вось ахвотных трымаць скаціну амаль не застаецца.

Дырэктар рэспубліканскага біялагічнага заказніка «Спораўскі» Вадзім ПРАТАСЕВІЧ зноў нагадвае, што абкошванне балот — гэта неабходная ўмова падтрымання іх у тонусе. Калі іх некалі касілі штогод, балоты сябе добра пачувалі. А як гадоў 30 таму вяскоўцы пакінулі гэтую справу, балоты паступова пачалі хваэрэць, зарастаць, сталі знікаць іх традыцыйныя насельнікі — птушкі і жывёлы. Вунь і маленькая вяртлявая чаротаўка, адна з галоўных гераінь кожнага фэсту, на мяжы знікнення. Таму фестываль быў задуманы як спроба прыцягнуць увагу да праблемы захаванасці беларускіх балот, адной з галоўных крыніц кіслароду. Некаторыя вучоныя лічаць, што балота і ёсць той пажыўны асяродак, у якім зараджаецца ўсё жывое.

І сапраўды, складваецца ўражанне, што ўсе ўдзельнікі спаборніцтва з сімпатыяй ставяцца да балота. Яму ўдзяляецца асаблівая ўвага, бо ўмовы на ўчастку, дзе праводзіцца пакос, надзвычай складаныя. Гэта вам не на лузе пракладваць пракосы, трывала адчуваючы пад нагамі зямлю. Тут даводзіцца махаць касой, стоячы ледзь не па калена ў вадзе, пры гэтым прыкладаць сілу, бо «трава» — цяжкая асака з чаротам. Удзельнікі пра асаблівасці дзялянкі ведаюць і рыхтуюцца да фестывалю цэлы год. І гэтым разам дзевятнаццаць каманд удзельнікаў атрымалі па паласе, якая складае 100 метраў у даўжыню і тры метры ў шырыню. Вышыня пакосу пры гэтым не павінна быць больш за 7,5 сантыметра. Ацэньваецца хуткасць касьбы, пры любых парушэннях налічваюцца штрафныя секунды.

Фота з тэлеграм-канала BEREZA.BY

...Прыгожа ідуць касцы, асабліва хораша назіраць за працэсам з дарогі, тады здаецца, што ім зусім не цяжка: размахваешся і зразаеш высокую траву. Насамрэч, гэта работа патрабуе спрыту і ўмення, якое некалі выпрацоўвалася гадамі. Ды і цяпер удзельнікі спаборніцтваў, як правіла, не навічкі. Падобна на тое, што традыцыяй становіцца ўдзел у чэмпіянаце жаночых каманд. Летась на пакосы выходзілі два жаночыя дуэты, і цяпер дзяўчаты не адсталі, удзельнічала жаночая каманда.

Многімі майстрамі можна было палюбавацца. Калі хто прыгожа і па-майстэрску косіць, заўсёды згадваю формулу Пятра Маліка. Гэта адзін з самых сталых удзельнікаў першага фестывалю. Ён гаварыў так: «Калі косіш і душа радуецца — вось гэта касьба! А калі робіш гэта нават пад асабістым унутраным прымусам — значыць, займаешся нарыхтоўкай кармоў альбо проста скошваннем травы». Вось гэта пра іх, касцоў, якім аддаў належнае Якуб Колас у «Новай зямлі». Памятаеце? «Другі хутчэй бы выбраў жонку, чым дзядзька добрую касу»!

Хто сказаў, што справа майстэрскага ручнога кашэння загінула на Палессі?! Апошняе цалкам абвяргаюць тыя, хто ў мінулую суботу атрымліваў прызы за перамогу і прызнанне гледачоў. У камандным спаборніцтве перамогу атрымалі «Какорыцкія асілкі» (Аляксандр Шыкула і Віктар Дашкевіч) — 1-е месца, «Землякі» (Віктар Здановіч і Мікалай Зуянаў) — 2-е месца, «Волаты Палесся» (Андрэй Шыкула і Генадзь Дашкевіч) — 3-е месца. У асабістым першынстве перамогу заваявалі Віктар Здановіч, Аляксандр Шыкула і Віктар Дашкевіч.

Нельга не сказаць пра яшчэ адну фішку фестывалю — футбол на балоце. Гэта спаборніцтва таксама збірае шмат гледачоў. Пабегаць па балоце з мячом — не лёгкая задача. Але амтараў такога не зусім звычайнага віду спорту менш не становіцца. У футбол гэтым разам згулялі дзевяць дружын з Бярозаўскага, Кобрынскага, Іванцэвіцкага раёнаў і Брэста. Усе яны былі адзначаны граматамі і каштоўнымі прызамі.

Вакол пляцовак спаборніцтваў разгарнуўся сапраўдны фестываль. Праходзілі выстаўкі-кірмашы рамесніцкіх вырабаў і сувеніраў, гандлёвыя палаткі прапаноўвалі розныя ласункі. Самадзейныя артысты стваралі настрой. Ахвотныя ўдзельнічалі ў майстар-класах па сплаве на байдарках, па маляванні. Працавала студыя настольных гульняў. Забаўлянак хапала на ўсе густы.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Бярозаўскі раён.

Фестываль

ТУР ДЭ ПОЛАЦК

Пяты рэспубліканскі фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу» прайшоў на старажытнай Полаччыне. Мы даведаліся, чым былі насычаныя два дні культурна-спартыўнага свята

ПАДАРОЖЖА Ў ГІСТОРЫЮ

Мерапрыемства пачалося з прэс-тура для прадстаўнікоў СМІ, арганізатараў і ўдзельнікаў фестывалю па славутых мясцінах Полацка. Ветліва прымала ўдзельнікаў «Вытокаў» адно з вядучых прадпрыемстваў у вытворчасці шкловалакна і матэрыялаў на яго аснове — ААТ «Полацк-Шкловалакно». Сучасны і дынамічны прамысловы комплекс размяшчаецца на мільёне квадратных метраў і прадстаўляе шырокую лінейку высакаякаснай прадукцыі.

Наступным прыпынкам на карце стаў мемарыяльны комплекс «Урочышча Пяскі». На працягу 1941—1943 гадоў тут у перасыльным лагеры для ваеннапалонных Дулаг-125 ад нацысцкага рэжыму тут загінула звыш 40 тысяч палонных байцоў Чырвонай Арміі, падпольшчыкаў, мірных жыхароў. Іх хавалі на ўзвышшы на левым беразе ракі Палаты. Дзе ў 2020 годзе тут адкрылі мемарыял. У рамках фестывалю на мемарыяльным комплексе прайшла патрыятычная акцыя «Памяць вечная», яе ўдзельнікі мінутай маўчання ўшанавалі памяць ахвяр фашызму і ўсклалі кветкі. Усе прысутныя атрымалі кнігу Сяргея Капыла «Урочышча Пяскі — тэрыторыя смерці», дзе апісаны зверствы і катаванні, якія перанеслі нашы людзі ў гады вайны ў лагерах.

Полацк — калыска не толькі нашай дзяржаўнасці, але і адукацыі. Удзельнікаў прэс-тура сустракаў новы **рэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Юрый РАМАНОЎСКІ.** Зусім нядаўна ўніверсітэту прысвоілі ганаровае імя Ефрасінні Полацкай. Захапляльная экскурсія па галоўным корпусе, на падлозе якога захавалася арыгінальная кафляная плітка пачатку XX стагоддзя; механічная галава, якая адказвае на філасофскія пытанні, (а аналагаў ёй няма ва ўсім свеце); музычны ўніверсітэцкі гадзіннік з парадам фігур славутых людзей Полацкай зямлі прывялі ў захапленне кожнага. А яшчэ тут жывуць цёплыя традыцыі: напрыклад, асаблівай увагі заслугоўвае «рэктарскі ўваход» — велічэзныя дзверы адчыняюцца толькі двойчы на год — у верасні для першакурснікаў і ў чэрвені для выпускнікоў, калі разам са студэнтамі праходзіць рэктар, запрашаючы ў студэнцкае жыццё або праводзячы ў дарослае маладых спецыялістаў. Кожны студэнт, які толькі далучыўся да вялікай сям'і ПДУ, пакідае ў летапісе — кнізе з залатымі старонкамі — свой запіс, як і выпускнікі, якія развітваюцца з альма-матар.

Завяршылася падарожжа па Полацку наведваннем галерэі-філіялу Полацкага нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

СПОРТ-ТАЙМ

У межах першага фестывальнага дня адбыўся круглы стол «Актуальныя пытанні падрыхтоўкі спартсменаў і шляхі іх вырашэння» з удзелам спецыялістаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры і Вышэйшай школы трэнераў, спецыялістаў спартыўных арганізацый Віцебшчыны. На семінар-практыкум запрашала і Беларуская алімпійская акадэмія, дзе ўдзельнікі свята знаёміліся з алімпійскімі каштоўнасцямі і дасягненнямі беларускіх спартсменаў.

У нядзелю галоўнай пляцоўкай для мерапрыемстваў стала плошча Свабоды. Тут прайшоў алімпійскі квэст, што аб'яднаў больш як 20 відаў спорту, па выніках яго пераможцы атрымлівалі каштоўныя падарункі; разгарнуліся шматлікія спартыўныя пляцоўкі. Бокс, валейбол, гандбол, кікбоксінг і нават арыентаванне — на любы густ. Інтэрактыўныя пляцоўкі прадставілі Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі і генеральны спонсар Нацыянальнага Алімпійскага камітэта ААТ «Белаграпрамбанк». Аціраў пот пасля спартыўных нагрузак, ды і проста адпачываў, можна было ў спецыяльнай палатцы. Ды і ўвогуле, арганізатары фестывалю паклапаціліся пра тое, каб удзельнікі свята не адчувалі недахопу ні ў чым. Для іх працавалі і медыцынскія пункты, і пункты харчавання, і нават пункты масажу.

Падчас афіцыйнага адкрыцця фестывалю **прэзідэнт Нацыянальнага Алімпійскага камітэта Беларусі Віктар ЛУКАШЭНКА** ўручыў **старшыні Полацкага раёвыканкама Ігару МАРКОВІЧУ** сертыфікат на 100 тысяч рублёў на развіццё спорту ў рэгіёне і пажадаў удзельнікам добрага настрою і высокіх вынікаў у спартыўных спаборніцтвах.

«Палачане заўсёды рады гасцям, але сёння нам удвая прыемна, што на гістарычнай полацкай зямлі, у Год гістарычнай памяці, у год святкавання 1160-годдзя Полацка тут праходзіць такі цудоўны фестываль «Вытокі», — падкрэсліў Ігар Марковіч. Ад усіх гараджан ён падзякаваў арганізатарам за свята і падарункі гораду, дадаўшы, што ўсё гэта дазволіць выразіць новых алімпійскіх чэмпіёнаў.

Дарэчы, упершыню на фестывалі была прадстаўлена пляцоўка паралімпійскага спорту, у яе межах майстар-клас па фехтаванні праводзіў паралімпійскі чэмпіён Рыа-2016 Андрэй Праневіч.

Другі дзень фестывалю стартаваў з насычанай спартыўнай праграмы. Яшчэ да цырымоніі адкрыцця свята прэзідэнт НАК Беларусі Віктар Лукашэнка наведаў некалькі аб'ектаў. У Наваполацку ён азнаёміўся з работай вучылішча алімпійскага рэзерву, наведаў СДЮШАР № 1 імя В. Шаршукова, дзе рыхтуюць цяжкаатлетаў, якія становяцца членамі нацыянальнай каманды, пераможцамі і прызёрамі турніраў, а таксама спартшколу для юных хакеістаў «Хімік». Таксама разам з кіраўніцтвам паўночнага рэгіёна Віктар Лукашэнка ўзяў удзел у цырымоніі ўскладання кветак да помніка «Вызваліцелям Полацка».

МАСТАЦКАЯ АСАЛОДА

На два жнівеньскія дні Полацк гасцінна расхінуў цёплыя абдымкі не толькі для спартсменаў, але і для майстроў народнай творчасці, артыстаў і дызайнераў. У гарадскім Доме культуры прайшоў майстар-клас па набіванцы «Маляванка. Вытокі самабытнага мастацтва», дзе госці і палачане змаглі азнаёміцца з вырабамі майстроў Беларусі і стварыць сваімі рукамі фестывальны сувенір. А вечарам прайшоў канцэрт арганнай музыкі Валерыя Шмата.

На галоўнай сцэне адбылася прэзентацыя калекцый адзення праекта «Роднае — моднае» ад беларускіх дызайнераў і прадпрыемстваў. Полацкія вулачкі ператварыліся ў каляровы горад майстроў, дзе кожны мог набыць на памяць вырабы з дрэва, адмысловыя аксесуары і сувеніры.

Святочную мяжу фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу» падвёў канцэрт з удзелам артыстаў беларускай эстрады. Фінальным пунктам культурна-спартыўнага фэсту ў 2022 годзе стане Капыль.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота БелТА.

Швабский сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 21 сентября 2022 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Ограничения в использовании, инфраструктура	Начальная цена (бел. рублей)	Размер задатка (бел. рублей)	Расходы по изготовлению документации (бел. рублей)
1	**д. Чеботари, ул. Лесная, д. 4** 623287605101000373 целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,2500	Черта населенного пункта Имеются сети: электрификации подъездные пути	3000,00	600,00	2282,80 + расходы за размещение объявления
2	**д. Таковщина, ул. Дачная, 55Б,** 623287608601000070 целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1722	Черта населенного пункта Имеются сети: электрификации	3000,00	600,00	2095,56 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона 21 сентября 2022 г. в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельский исполнительный комитет. Контактные телефоны: **8 (01774) 59 135, 59 235; (+37529) 1071617.**

Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 (кроме субботы и воскресенья) по 15.09.2022 включительно.

Для участия в аукционе необходимо:

1) подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведении аукционов;

2) представить квитанцию об уплате суммы задатка;

3) представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;

4) заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Задаток перечисляется на р/с № BY21AKBB36006191611010000000, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, г. Логойска. УНП 600537220, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901. **Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Ориентировочная сумма затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежит возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» составляет:

д. Чеботари, ул. Лесная, д. 4 составляет: ориентировочно – 14 549,10 бел. руб. (сети электроснабжения ориентировочно – 9768,00; объекты транспортной инфраструктуры – 4781,75);

д. Таковщина, ул. Дачная, д. 55Б составляет: 9768,00 бел. руб (сети электроснабжения ориентировочно – 9768,00.)

Напярэдадні падзеі

Важная вяха ў гісторыі праваслаўя на Беларусі

У дзень знаходжання Мінскай іконы Божай Маці, 26 жніўня, у сталіцы пройдуць урачыстасці, прымеркаваныя да святкавання 1030-годдзя праваслаўя на беларускіх землях.

Цэнтральнай падзеяй стане саборная Божая літургія, якую здзейсніць Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веніямін у саслужэнні духавенства Беларускай праваслаўнай царквы перад Свята-Духавым кафедральным саборам. Напярэдадні богаслужэння адбудзецца сустрэча Усебеларускага хрэснага ходу да Мінскай іконы Божай Маці. Усебеларускі хрэсны ход пачнецца 19 жніўня, у свята Праабражэння Гасподняга, ад Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра. Паломнікі пройдуць 250 км праз чатыры епархіі, паклоняцца святыням 18 храмаў. Завершыцца хрэсны ход 26 жніўня ўрачыстым шэсцем ад храма Пакрову Прасвятой Багародзіцы да Свята-Духава кафедральнага сабора, дзе Патрыяршы экзарх здзейсніць Божую літургію і малебен перад цудатворным абразам Божай Маці Мінскай.

Мінская ікона Божай Маці — адна з галоўных і найбольш шанаваных праваслаўных святыняў нашай зямлі — паводле паданняў, была знойдзена ў 1500 годзе на водах Свіслачы. З таго часу абраз неаднаразова знаходзіцца ў горадзе Мінску. Прыхаджане заўсёды ставіліся з вялікай пашанай да святога абраза, здолелі зберагчы яго падчас гаганненняў на веру і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1945 годзе абраз Божай Маці быў перанесены ў Свята-Духаў кафедральны сабор, дзе і знаходзіцца дагэтуль.

САЦЫЯЛЬНАЕ СЛУЖЭННЕ

Пад старшынствам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандра РУМАКА на пасяджэнні Каардынацыйнага савета па распрацоўцы і рэалізацыі сумесных праграм супрацоўніцтва паміж органамі дзяржкіравання і Беларускай праваслаўнай царквой абмяркоўваліся сацыяльныя праекты і праграмы, дзякуючы якім розныя катэгорыі грамадзян атрымліваюць неабходную дапамогу. Мерапрыемства прайшло на базе Дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў «Выток». У ім прынялі ўдзел міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі; святары беларускага Экзархата; прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, якія рэалізуюць сацыяльныя праграмы сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой; камітэтаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне; упраўленняў ідэалагічнай работы аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

СЯМЕЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

За доўгія гады супрацоўніцтва дзяржорганаў і беларускай праваслаўнай царквы назапашаны багаты вопыт па вырашэнні розных праблем і аказанні дапамогі інвалідам, састарэлым, людзям, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю. Ірына Касцевіч звярнула ўвагу на тыя сацыяльныя выклікі, якія сёння стаяць перад грамадствам. Насельніцтва старэе. Сёння ў краіне пражывае два мільёны састарэлых людзей, пяць мільёна чалавек, якія маюць інваліднасць. Нараджальнасць зніжаецца, сярод прычын гэтага, у тым ліку, познія шлюбы і павелічэнне колькасці разводаў. Адпаведна, сёння ўжо варта прасоўваць сярод моладзі традыцыйныя сямейныя каштоўнасці. Ірына Анатольеўна згадала адну з сустрэч з хлопцамі і дзяўчатамі 16—18 гадоў. Калі ў маладых людзей запыталі, ці хацелі б яны мець у будучыні сям'ю, быў лес рук. Але калі пытанне канкрэтызавалі: «Ці хацелі б вы, каб у вас была такая сям'я і ўзаемаадносіны, як у вашых бацькоў?», рукі ўжо многія не паднялі. «Шчасце нашых дзяцей шмат у чым залежыць ад кожнага з нас. Мы павінны стаць для іх прыкладам», — заўважыла Ірына Касцевіч і нагадала, што перад дзяржслужачымі стаіць задача па прасоўванні ідэалогіі, традыцыйных каштоўнасцяў, узорнага сямейнага жыцця.

14 кастрычніка ў Беларусі адзначаецца Дзень маці, 21 кастрычніка — Дзень бацькі, і, на думку міністра, варта было б запусціць новы праект «Тыдзень бацькоўскай любові», каб гэту добрую, важную тэму прасоўваць у сям'і, уздымаць пытанні, якія датычацца павагі да маці і таты і адказнасці бацькоў за выхаванне дзяцей.

Таксама сёлета плануецца запусціць праект «Павага. Клопат. Адказнасць» — з дапамогай якога звярнуць увагу грамадскасці на ўзаемаадносіны дарослых дзяцей і іх бацькоў састарэлага ўзросту, паказаць, наколькі важныя разуменне і клопат.

СЯРЭБРАНЫЯ ВАЛАНЦЁРЫ

Для вырашэння шматлікіх сацыяльных пытанняў патрэбны надзейныя партнёры, тым больш што часам людзям патрэбна індывідуальная, духоўная падтрымка. Сёння ў краіне створана 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, многія з іх шчыльна працуюць са святарамі.

У Іванаўскім тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва праводзяцца, напрыклад, духоўна-асветніцкія заняткі, сумесныя сустрэчы, культурна-масавыя мерапрыемствы, сустрэчы на базе клубаў і гурткоў.

У аддзяленні забеспячэння дзённага знаходжання для інвалідаў з мэтай садзейнічання духоўна-маральнаму развіццю інвалідаў і іх сацыялізацыі праводзяцца «Урокі праваслаўя». Традыцыйнымі сталі сумесныя мерапрыемствы для маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі і іх бацькоў з удзелам святароў. Да вялікіх хрысціянскіх свят сюды, у тэрытарыяльны цэнтр, прыходзяць выхаванцы нядзельных школ, якія дзейнічаюць пры мясцовых храмах. Яны паказваюць тэатральныя пастаноўкі, ладзяць канцэрты. Такім чынам людзі з інваліднасцю атрымліваюць дадатковыя кантакты з навакольным светам, а госці больш даведваюцца пра патрэбы і мары асоб з абмежаванымі магчымасцямі, а часта апошнім не хапае проста зносін і разумення. Пры аддзяленні забеспячэння дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту ў Іванаўскім тэрытарыяльным цэнтры функцыянуе клуб «Асновы праваслаўнай культуры». Пенсіянеры заўсёды рады сустрэчам, гутаркам са святаром, вывучаюць праваслаўную літаратуру, наведваюць храм. У аддзяленні арганізавана і валанцёрская група з ліку састарэлых людзей «Адкрытыя сэрцы». Валанцёры сярэбранага ўзросту з'яўляюцца членамі сястрыцтва пры храме. Яны дапамагаюць адзінокім пацыентам Іванаўскай цэнтральнай раённай бальніцы ў дастаўцы лекаў, прадуктаў, кніг, пераадоленні пачуцця адзіноты, запрашаюць сваіх новых знаёмых на службу ў храм. А тых, хто мае патрэбу ў дадатковай падтрымцы і пражывае адзін, наведваюць дома. Толькі за 2022 год дапамогу такіх валанцёраў атрымала больш чым паўсотні чалавек. Акрамя таго, неабыякавыя валанцёры сястрыцтва ўзялі шэфства над маладымі інвалідамі аддзялення дзённага знаходжання. Яны суправаджаюць іх на службу, знаходзяцца з імі падчас богаслужэння. Таксама праводзяць майстар-класы па вырабе сувеніраў.

ПРАЦОЎНАЕ ПАСЛУШЭНСТВА

Як паведаміла намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама Надзея Цупа, сёння ўстановы сацыяльнага абслугоўвання Міншчыны супрацоўнічаюць з 79 праваслаўнымі рэлігійнымі арганізацыямі. Сустрэчы адбываюцца ў межах круглых сталоў, акцый, мерапрыемстваў, клубаў. А вопыт, атрыманы падчас сацыяльных праектаў, якія рэалізоўваюцца ў вобласці, варта пераймаць і тыражыраваць у іншых рэгіёнах краіны. Варта згадаць праграмы, накіраваныя на аказанне дапамогі залежным, бяздомным, састарэлым, людзям з інваліднасцю, альбо скіраваныя на падтрымку традыцыйнай сям'і, мацярынства і дзяцінства. Наогул, у вобласці рэалізоўваецца больш за 50 сумесных сацыяльных праектаў. Адзін з іх — «Да праваслаўнай веры і культуры праз жэсты» — рэалізоўваецца тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання Барысаўскага раёна з прыходам храма Раства Хрыстова ў Барысаве. Спачатку праект быў скіраваны на інвалідаў з парушэннем слыху, якія знаходзяцца ў аддзяленні суправаджальнага пражывання. Але інфармацыя пра такую магчымасць задавольціць патрэбу ў духоўным развіцці хутка распаўсюдзілася, і сёння праект ахоплівае ўжо 139 жыхароў раёна, якія маюць праблемы са слыхам.

У аграгарадку Міханавічы пры прыходзе храма Свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага яшчэ ў 2015 годзе пачало працаваць аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў. Праз пэўны час яно пачало прымаць і састарэлых людзей. Такі «прытулак» пры храме выдатна дэманструе, як царква і дзяржструктуры могуць супрацоўнічаць пры выкарыстанні дзяржаўнага сацыяльнага заказу. «У дзеяным праекце арганічна спалучаюцца, аб'ядноўваюцца, узаемадапаўняюць адзін аднаго рэсурсы дзяржавы і царквы, — заўважыў настаяцель храма Свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага ў аграгарадку Міханавічы іерэй Дзімітрый Грыцэнка.

Падобны станоўчы вопыт плануецца развіваць. Разглядаецца пытанне аб адкрыцці аддзялення дзённага знаходжання для людзей з інваліднасцю пры царкве ў гарадскім пасёлку Смілавічы.

ДАЦЬ ШАНЦ УСІМ

Праваслаўная царква займаецца і работай па рэабілітацыі тых, хто мае алкагольную ці наркатычную залежнасць, бярэ пад апеку людзей, якія вызвалены з месцаў пазбаўлення волі. Асобы, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю, засталіся без жылля, знаходзяць месца ў прытулку Свята-Елісавецінскага манастыра. Яны накіроўваюцца на выпрабавальны тэрмін (3—6 месяцаў) на падвор'е. На кожнага ўскладаюцца працоўныя абавязкі па здольнасцях. Напрыклад, жанчыны могуць працаваць на кухні, на агародзе, займацца шыццём і рукадзеллем, мужчыны — браць на сябе больш цяжкія работы. Пасля разам з манахінямі людзі абмяркоўваюць сваё жыццё, далейшыя яго шляхі. Між іншым, працоўнае паслушэнства добра спрацоўвае як адзін з элементаў рэабілітацыі. Яно дапамагае забыцца на цяжкія, негатыўныя думкі. Да таго ж манахіні аказваюць людзям духоўную падтрымку, падштурхоўваюць сваіх падапечных да гутарак-разважанняў пра іх далейшае жыццё.

Сёстрамі міласэрнасці назапашаны вопыт дапамогі па рэабілітацыі асоб, якія маюць псіханеўралагічныя захворванні. У мастацкіх майстэрнях пры манастыры яны могуць атрымаць новыя навыкі працы, дапамогу псіхолага, развіць свой творчы патэнцыял. Тут створана спрыяльная духоўная атмасфера, фарміруюцца ўяўленні аб праваслаўных традыцыях і культуры, а галоўнае, людзі вяртаюць веру ў сябе.

— Служэнне ў галіне сацыяльнай абароны насельніцтва немагчыма пераацаніць асабліва ў свеце, дзе чалавек часцей за ўсё сутыкаецца з выпрабаваннем, звязаным са стратай здароўя, сям'і ці іншымі цяжкімі выпрабаваннямі, — заўважыў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін. — У гэтым служэнні Міністэрства працы, гэтак жа як і царква, ніколі не дзеліць людзей на сваіх ці чужых, не шукае ў гэтай святой справе якой-небудзь зямной, матэрыяльнай выгады. І кожны чалавек, які мае патрэбу ў дапамозе, становіцца прадметам клопату.

Ганна ПЯТРОВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

Лот № 1: здание гаража общей площадью 1223 кв. м с инв. № 630/С-79859, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодёжная, 2Б/1 (далее – Объект).

Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004253 (право постоянного пользования) площадью 4,6001 га, для обслуживания Объекта будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

Земельный участок имеет ограничения прав: охранная зона линий электропередачи, пл. 0,0808 га, охранная зона магистральных трубопроводов, пл. 0,9286 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 111 000,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – (**11 100,00** бел. руб.). Цена снижена на 50 %.

Лот № 2:

крытая крановая эстакада общей площадью 1162,8 кв. м, с инв. № 630/С-42062, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/9;

сборно-тросовая мастерская общей площадью 577,4 кв. м, с инв. № 630/С-42061, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/8.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 155 952,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – (**15 595,00** бел. руб.). Цена снижена на 40 %.

Лот № 3:

цех металлообработки № 2 *(составные части и принадлежности: пристройка, навес, дымовая труба)* **общей площадью 1222,0 кв. м с инв. № 630/С-46869, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/4,**

здание склада нефтепродуктов с инв. № 630/С-46865 общей площадью 47 кв. м, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/6.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

Объекты обременены договорами аренды (сведения можно получить у Организатора торгов).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 113 904,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – (**11 390,00** бел. руб.). Цена снижена на 60 %.

Лот № 4:

цех металлообработки № 1 *(составные части и принадлежности: пристройка, 2 (два) навеса)* **общей площадью 1740 кв. м с инв. № 630/С-46860, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/3. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 436 320,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – (**43 632,00** бел. руб.). Цена снижена на 10 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 02.04.2022, 11.05.2022, 02.06.2022, 02.07.2022, 26.07.2022 (по лотам №№ 1,2), 27.01.2022, 02.04.2022, 19.04.2022, 11.05.2022, 02.06.2022, 02.07.2022, 26.07.2022 (по лоту № 3), 28.06.2022 (по лоту № 4).

Аукцион состоится **07.09.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.09.2022** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.

Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ СЛЕДУЮЩИХ ИЗМЕНЕНИЙ

в извещение о проведении 16.08.2022 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС» (опубликовано в газете «Звязда» 02.08.2022):

предмет аукциона № 6 исключается из текста публикации в связи с отказом продавца от проведения аукциона.

Телефон для справок +375 (17) 360 42 22.
Адрес в сети интернет: www.mgcn.by.

УНП 190398583

Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» сообщает об отмене электронных торгов № 2022.Ч.000.00076 по продаже недвижимого имущества ОАО «ВПЗ», назначенных на 23.08.2022 на электронной торговой площадке etpvit.by, опубликованных в газете «Звязда» 23.07.2022, на сайте Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by/ru/ 22/07.2022. Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63. УНП 390477566

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 40 %) по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «ГродноОблсельхозтехника»

Предмет торгов	Начальная цена с учетом НДС, руб.	Сумма задатка (1 %), руб.
Лот № 1. Свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2, 2008 г. в., зав. № 2310060, рег. № СК-4 2832	41 206,40	412,00
Местонахождение имущества: Гродненская обл., Щучинский р-н, аг. Рожанка (ОАО «Щучинский ремонтный завод»)		
Сведения о продавце: ОАО «Управляющая компания холдинга «ГродноОблсельхозтехника», г. Гродно, ул. Лермонтова, 2, тел. 8 (0152) 626024		
Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621631, счет BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906		
Торги состоятся 29 августа 2022 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8		
Срок подачи документов для участия в торгах	**по 23 августа 2022 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**	

Аукцион без условий. Шаг аукциона – 5 %. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней с момента проведения аукциона.

Условия оплаты: 100 % предоплата. Условия участия и порядок проведения аукциона по тел. 8 (0152) 621632, 621630 и на сайте www.fincentr.by.

Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00, ответственное лицо: Болдовский Алексей Геннадьевич, тел.: в г. Гродно 8 (0152) 626020, 626024. Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 21.05.2022, 22.06.2022, 07.07.2022, 19.07.2022, 03.08.2022.

КАМУ — ЗА ГРОШЫ, КАМУ — БЯСПЛАТНА

Спецыялісты расказалі, што робіцца ў Беларусі падчас мадэрнізацыі электрасетак

Бясплатная рэканструкцыя ў рэгіёнах, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. Магчымасць беларусаў паўдзельнічаць уласным рублём у мадэрнізацыі электрасетак. Завышаныя патрэбы людзей у электрамагутнасці і стымуляцыйныя тарыфы. Пра гэтыя і іншыя асаблівасці павелічэння ўжывання электраэнергіі ў краіне і мадэрнізацыю электрычных сетак расказалі спецыялісты «Белэнерга».

ПАЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ ФІНАНСАВА

Каб электрасеткі маглі выкарыстоўвацца для патрэб ацяплення, гарачага водазабеспячэння і гатавання ежы, недастаткова проста аднавіць іх папярэдні стан. Неабходна павялічыць іх прапускную здольнасць, што ў сваю чаргу патрабуе значна большых капіталаўкладанняў, вымушае энергетыкаў шукаць дадатковыя крыніцы фінансавання, абазначыў **Андрэй НЯГОДЗЬКА, начальнік упраўлення стратэгічнага развіцця «Белэнерга»:**

— Летась з удзелам Міністэрства энергетыкі і «Белэнерга» падрыхтаваны Указ Прэзідэнта № 381 «Аб будаўніцтве размеркавальных электрычных сетак», а таксама пастанова Саўміна № 796, прынятая 31 снежня 2021 года. Згодна з гэтымі дакументамі, грамадзяне могуць удзельнічаць у фінансаванні работ па будаўніцтве размеркавальных электрасетак да адасобленых дамоў і рэканструкцыі сетак у раёнах індывідуальнай жылой забудовы.

Пакуль рана ацэньваць работу ў гэтым кірунку, бо райвыканкамы сёлета толькі першы год як атрымалі магчымасць апытваць людзей, ці хочуць яны грашова паўдзельнічаць у рэканструкцыі незамартызаваных размеркавальных электрасетак для выкарыстання электрычнасці на гарачае водазабеспячэнне, ацяпленне і гатаванне ежы, дадаў ён:

— З мая да 1 ліпеня райвыканкамы павінны былі праводзіць апытанні людзей, якія выказалі жаданне карыстацца энергіяй для такіх патрэб. І калі грамадзяне будуць згодныя на аплату, энергазабяспечвальным арганізацыям накіруюць звесткі пра гэта. Налета (у 2023-м) адпаведныя аб'екты будуць уключаны ў планы праектавання, а праз год (у 2024-м) — у планы будаўніцтва.

Мяркуецца, што беларусы будуць аплачваць 30 % ад каштарысу такіх работ, растэрміноўкі пры гэтым не прадугледжаны.

Сёлета Міністэрства энергетыкі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і «Белэнерга» падрыхтавалі пастанову Саўміна № 386, якая ўносіць змены ў дзяржпраграму па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

— Сярод новаўвядзенняў — магчымасць беларусаў, якія жывуць на тэрыторыях, што падвергліся радыеактыўнаму забруджванню, разлічваць на тое, што размеркавальныя электрычныя сеткі і ўнутрыдамавыя сістэмы электразабеспячэння будуць рэканструяваны, каб жыхары маглі выкарыстоўваць электрычнасць на патрэбы гарачага водазабеспячэння, ацяплення і гатавання ежы, — акрэсліў Андрэй Нягодзька. — Ажыццяўляецца рэканструкцыя будзе за кошт сродкаў, выдзеленых на рэалізацыю дзяржпраграмы, то-бок энергетыкаў. А парадак выканання работ вызначаць інструкцыяй, якую зацвердзяць Мінэнерга і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Пасля аварыі на Гомельшчыне актыўна праходзіла газіфікацыя населеных пунктаў, дзе людзі засталіся жыць на забруджаных тэрыторыях, каб насельніцтва не выкарыстоўвала для ацяплення забруджаныя мясцовыя віды паліва. Цяпер жа райвыканкамы вырашаюць, што будзе менш затратна — электрыфікаваць мястэчкі ці працягваць іх газіфікацыю. Аплачвацца работы па электрыфікацыі будуць за кошт улады.



ПРАПУСКНАЯ ЗДОЛЬНАСЦЬ І ЯЕ ЗАВЫШЭННЕ

Асобны клопат энергетыкаў — падключэнне электраўстановак сістэм ацяплення, гарачага водазабеспячэння і гатавання ежы да размеркавальных электрасетак, якія эксплуатуюцца.

Яны праектаваліся без уліку выкарыстання электраэнергіі для гатавання ежы, гарачага водазабеспячэння і ацяплення, маюць абмежаваны рэзерв прапускной здольнасці, патлумачыў спецыяліст.

— Гэты рэзерв размяркоўваецца энергазабяспечвальнымі арганізацыямі ў парадку паступлення запытаў на выдачу тэхнічных умоў (ТУ). Пры гэтым колькасць ТУ, якія змогуць выдаць энергетыкі, залежыць у тым ліку і ад саміх грамадзян. Як паказвае практыка, электрычная магутнасць, якую людзі ўказваюць у запытах на выдачу ТУ, часам вызначаецца або інтуітыўна, або па парадзе знаёмых. У большасці выпадкаў гэта прыводзіць да завышэння запытваемай электрамагутнасці і неабгрунтаванага скарачэння рэзерву прапускной здольнасці размеркавальных электрасетак.

Да таго ж мноства грамадзян, якія вырашаюць выкарыстоўваць электраэнергію для ацяплення, не думаюць пра цеплавую мадэрнізацыю свайго будынка. Калі яе не зрабіць, то спатрэбіцца ўстаноўка ацяпляльных прылад большай магутнасці, што пацягне за сабой павелічэнне расходу электрычнасці і, як вынік, узрасце плата за яе, дадалі спецыялісты.

ПАМЯТКІ І АЛГАРЫТМ ДЗЕЯННЯЎ

Каб беларусы разумелі, як правільна вызначыць магутнасць, «Белэнерга» распрацавала памяткі, якія змешчаны на сайце прадпрыемства ў раздзеле «Фізічным асобам». Тут падрабязна і дэталёва выкладзена паслядоўнасць дзеянняў па падключэнні да размеркавальных электрасетак і ёсць парады, як вызначыць нагрузку, якая патрэбна для пэўных мэт у доме.

Тэхнічныя ўмовы выдаюць па запыце мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Чалавеку трэба звярнуцца ў адпаведны орган па месцы знаходжання сваёй электраўстаноўкі, расказаў **Віктар РУДКОЎСКІ, начальнік упраўлення эксплуатацыі электрычных сетак «Белэнерга»:**

— Калі тэхнічная магчымасць на далучэнне існуе, то ТУ выдаюць у парадку чарговасці і рэгістрацыі заяў. Калі забяспечыць патрэбны паказчык электраэнергіі тэхнічна немагчыма, то энергазабяспечвальная арганізацыя інфармуе мясцовы выканкам аб адмове ў выдачы тэхнічных умоў і тэрмінах правядзення рэканструкцыі электрасетак. Інфармацыя аб адмове ў выдачы ТУ ўлічваецца энергетыкамі пры прыняцці рашэння аб першачарговай рэканструкцыі замартызаваных электрасетак.

Больш за ўсё заяў на выдачу ТУ паступіла ў «Мінскэнерга» (звыш чатырох тысяч), а найменш — у «Гомельэнерга» (850 заяў). Адпаведны і працэнт задаволеных запытаў на выдачу тэхнічных умоў. Па краіне ж гэты паказчык — 83 %. Сёлета ў Беларусі больш за 4400 спажыўцоў атрымалі магчымасць выкарыстоўваць электраэнергію на патрэбы ацяплення, гарачага водазабеспячэння і гатавання ежы.

КАБ ЗМЯНІЦЬ ТАРЫФ, ПАТРЭБНЫ ЭЛЕКТРОННЫ ЛІЧЫЛЬНІК

Каб заахвочваць беларусаў выкарыстоўваць больш электраэнергіі, у краіне ўведзены стымуляцыйныя тарыфы. Прынамсі, з 1 снежня 2018 года ў краіне была ўведзена тарыфная група электраэнергіі пры ўмове яе выкарыстання для патрэб ацяплення, ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў жылых дамах і кватэрах, якія не маюць сістэм цэнтралізаванага цепла- і газазабеспячэння і абсталяваны электраплітамі пры адсутнасці асобнай дадатковай прылады індывідуальнага ўліку расходу электраэнергіі для патрэб ацяплення, ацяплення і гарачага водазабеспячэння. Гэты тарыф з 1 студзеня 2022 года складае 9,81 капейкі за 1 кВт·г, расказаў **Віктар ЖЫТКЕВІЧ, начальнік упраўлення збыту электраэнергіі «Белэнерга».**

— Для гэтай тарыфнай групы прадугледжаны дыферэнцыраваныя тарыфы па двух часовых перыядах. З 1 студзеня 2022 года ў гадзіны мінімальных нагрузак (з 23.00 да 6.00) — 6,87 капейкі за 1 кВт·г, а ў астатні час сутак — 12,75 капейкі за 1 кВт·г.

З 1 студзеня 2019-га ўстаноўлена тарыфная група электраэнергіі для патрэб ацяплення, ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў жылых дамах і кватэрах, якія не абсталяваны сістэмамі цэнтралізаванага цепла- і газазабеспячэння пры наяўнасці асобнай дадатковай прылады індывідуальнага ўліку расходу электраэнергіі для гэтых патрэб. З 1 студзеня 2022-га ён складае 3,98 капейкі за 1 кВт·г.

За 2020-ы на разлікі па тарыфах за электраэнергію для гэтых патрэб перайшлі звыш 10 тысяч бытавых абанентаў, а на пачатак другога паўгоддзя сёлета іх стала ўжо 31,1 тысячы. Амаль 10 тысяч — у сталіцы і Мінскай вобласці, у Віцебскай — 7,6 тысячы, у Магілёўскай — 4,5 тысячы, у Гродзенскай — 3,5 тысячы, у Брэсцкай — 3,3 тысячы, у Гомельскай — 2,3 тысячы. За 2020-ы спажыўцы гэтай групы ўжылі 89 мільёнаў кВт·г, летась — 268 мільёнаў кВт·г, і сёлета — больш за 256 мільёнаў кВт·г, падзяліўся лічбамі прадстаўнік «Белэнерга»:

— Каб скарыстацца гэтымі тарыфамі, неабходна абавязковая наяўнасць электроннай прылады ўліку. Толькі з яго дапамогай можна перайсці на тарыфы, якія дыферэнцыруюцца па зонах сутак. У Беларусі зараз эксплуатуецца 4 мільёны 567 тысяч аднафазных лічыльнікаў энергіі, з якіх 3 мільёны 800 тысяч (84,4 %) — электрычныя. А таксама 694,6 тысячы — трохфазных лічыльнікаў, з якіх 573,8 тысячы (82,6 %) — электронныя.

Праграма мадэрнізацыі сродкаў уліку электраэнергіі запрацавала з 2016-га. Да 2023-га ў яе межах плануецца замяніць 3,5 мільёна прылад уліку электраэнергіі. Замест старых індукцыйных лічыльнікаў, найперш класа дакладнасці 2,5, у беларусаў з'явіцца сучасныя электронныя прылады ўліку. Пазней усе яны будуць аб'яднаны ў аўтаматызаваную сістэму камерцыйнага ўліку электраэнергіі (АСКУЭ).

Летась у «Белэнерга» прынялі праграму аб стварэнні ў жыллёвым фондзе аўтаматызаваных сістэм кантролю і ўліку электраэнергіі магутнасці — АСКУЭ-быт, якая будзе дзейнічаць да 2025 года. За мінулы год, згодна з праграмай, створана ўжо 3326 АСКУЭ-быт, якія аб'ядноўваюць 373 тысячы прылад уліку. Усяго ж у краіне ўжо існуе 22 тысячы АСКУЭ-быт, якая аб'ядноўвае амаль 2 мільёны бытавых абанентаў. Пры перадачы сістэм на баланс энергазабяспечвальных арганізацый менавіта энергетыкі будуць несці затраты на іх рамонт і абслугоўванне, запэўнілі спецыялісты.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Здарэнні

Чарговы падман аб ДТЗ

Мінчанка за два разы пазбавілася 37 тысяч долараў

Схема «разводу» тая ж: званок пенсіянеркі на хатні тэлефон і паведамленне аб ДТЗ, у якім па віне яе сына пацярпела цяжарная, і просьба перадаць 15 тысяч долараў кур'еру (што жанчына і зрабіла) для вызвалення хлопца ад адказнасці.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, другі званок для маці стаў яшчэ страшнейшым: пасля аварыі сын нібыта знаходзіцца ў бальніцы і мае патрэбу ў дзвюх платных аперацыях.

На лячэнне былі перададзены яшчэ 22 тысячы долараў.

Кур'ера затрымалі праз два дні сышчыкі мінскай міліцыі. Як і яго многія «калегі», прапанову аб дадатковым заробку ён знайшоў у тэлеграм-канале. Украдзенае ён паспеў перадаць пасрэдніку.

На затрыманага завялі крымінальную справу за махлярства ў асабліва буйным памеры.

Хованка ў суседкі не дапамагла

У Камянецкі РАУС звярнулася 57-гадовая жыхарка раёна, якая паведаміла, што ў яе зніклі ўсе грашовыя зберажэнні. Аператыўнікі крымінальнага вышуку высветлілі, што крадзеж здзейсніла 37-гадовая дачка заяўніцы, якая жыве ў Брэсце, але перыядычна заязджае наведаць сваякоў у вёсцы.

Як паведамляе падрабязнасці здарэння аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, маці, ведаючы аб схільнасці сваёй дачкі разам з сужыцелем да здзяйснення неабдуманых трат, аднесла грошы ў колькасці 1200 еўра, 450 долараў і 2000 рублёў да суседкі, каб схаваць. Маладая жанчына даведалася аб месцы захоўвання. Ведаючы распарадак дня гаспадароў, брастаўчанка падабрала момант, калі нікога не было дома, і ўкрала схаваную маёмасць.

Праваахоўнікам жанчына паведаміла, што ўкрадзенае расходавала на асабістыя патрэбы: аддала даўгі, здзейсніла некалькі дарагіх пакупак, а значную частку выдаткавала на платныя анлайн-гульні ў сеціве.

Дзеянням падазраванай дадзена прававая ацэнка. На яе завялі крымінальную справу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прыёмная кампанія: хто штурмаваў ВНУ?

ПАШЫРЭННЕ МЭТАВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

— Бюджэтных месцаў у нас было амаль 27,8 тысячы. Практычна на 100 % бюджэтны набор выкананы. На платнай форме навучання прасочваецца тая ж тэндэнцыя. З 25,5 тысячы месцаў для платнікаў больш як 95 працэнтаў запоўнены. Шэраг універсітэтаў аб'явілі сёлета прыём на новыя спецыяльнасці. Іх было каля паўтара дзясятка: «Урбаналогія і сіці-менеджмент», «Геаінфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай і экскурсійнай дзейнасці», «Біяінфарматыка і біяінжынерыя» і іншыя. Усе яны карысталіся высокім попытам сярод абітурыентаў. Планавыя лічбы набору і на бюджэт, і на платную форму па гэтых спецыяльнасцях былі выкананы, што сведчыць і аб вельмі эфектыўнай інфармацыйнай рабоце, і, вядома ж, аб цікавасці выпускнікоў школ і іншых устаноў да атрымання адукацыі па новых запатрабаваных спецыяльнасцях. А новыя спецыяльнасці адкрываюцца тады, калі на іх ёсць запыт з боку заказчыкаў кадраў і работадаўцаў, — падкрэсліваў начальнік галоўнага ўпраўлення.

Безумоўна, адной з адметнасцяў сёлетняй прыёмнай кампаніі стала пашырэнне мэтавай падрыхтоўкі. Калі раней яна распаўсюджвалася толькі на пэўныя населеныя пункты (чарнобыльскія, сельскія рэгіёны, гарады з насельніцтвам да 20 тысяч), то цяпер такі дагавор можа заключыць арганізацыя — заказчык кадраў, якая знаходзіцца ў любым населеным пункце Беларусі, у тым ліку ў сталіцы.

Напрыклад, у Акадэміі кіравання сёлета было выдзелена пяць месцаў для залічэння абітурыентаў за кошт рэспубліканскага бюджэту на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі: тры — на спецыяльнасць «Дзяржаўнае кіраванне і права» і па адным — на спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» і «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі». Арганізацыі, якія накіравалі абітурыентаў для навучання на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, — Маладзечанскі раённы выканаўчы камітэт, Мінскае гарадское агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры і Шумілінскі раённы выканаўчы камітэт.

Сяргей Каспяровіч адзначыў, што мэтавая форма падрыхтоўкі карыстаецца попытам і ў абітурыентаў, і ў заказчыкаў. У асобных выпадках на мэтавыя месцы складваўся нават больш высокі конкурс і прахадны бал, чым на агульную траекторыю паступлення на бюджэтную форму атрымання адукацыі.

Напрыклад, у БДПУ 210 абітурыентаў былі залічаны на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Гэта амаль чвэрць ад агульнай колькасці першакурснікаў дзённай формы атрымання адукацыі. У апошнія гады ў вядучым педагагічным універсітэце краіны назіраюць тэндэнцыю павышэння ўзроўню падрыхтаванасці абітурыентаў-«мэтавікаў». Іх балы часта перавышаюць прахадныя па агульным конкурсе. 10 працэнтаў «мэтавікаў» мелі 300 балаў і больш, каля 50 працэнтаў — 240 балаў і больш. Гэта сведчыць аб тым, што, па-першае, заказчыкі кадраў сталі больш старанна адбіраць кандыдатаў для заключэння мэтавых дагавораў, а па-другое, — аб павышэнні цікавасці да педагагічнай прафесіі з боку абітурыентаў і іх бацькоў, асабліва ў рэгіёнах.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЦІКАВАСЦЬ ДА ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАФЕСІІ

Увогуле, вынікі прыёмнай кампаніі ў БДПУ ўсяляюць аптымізм. У сярэднім па ўсіх спецыяльнасцях конкурс на бюджэтныя месцы склаў больш за 2 чалавекі на месца. Па чатырох спецыяльнасцях прахадны бал перавысіў 300: «Псіхалогія» — 324 балы (конкурс — 4,1 чалавека на месца), «Практычная псіхалогія» — 315 балаў (2,7 чалавека на месца), «Лагапедыя» — 306 балаў (2,1 чалавека на месца), «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка» — 302 балы (5 чалавек на месца). На чатыры спецыяльнасці («Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», «Руская мова і літаратура», «Руская мова і літаратура, замежная мова», «Аздараўленчая і адаптыўная фізічная культура») залічаны толькі тыя, хто валодаў ільготамі на паступленне без іспытаў (медалісты і ўладальнікі дыпломаў з адзнакай, выпускнікі педагагічных класаў, пераможцы прадметных алімпіяд). 20 працэнтаў абітурыентаў (87 чалавек), якія паступалі па агульным конкурсе, маюць 300 і больш балаў.

«Хтосьці з маладых людзей з высокімі баламі свядома зрабіў стаўку на платнае навучанне».

Сёлета, як і ў папярэднія гады, назіралася тэндэнцыя павелічэння колькасці хлопцаў, якія выбіраюць месцам навучання БДПУ. Так, на факультэце фізічнага выхавання іх 69 працэнтаў ад агульнай колькасці залічаных, на гістарычным — 53 працэнты і на фізіка-матэматычным — 42 працэнты.

На платнае навучанне ў педуніверсітэт было пададзена 1126 заяў пры плане прыёму на дзённую форму атрымання адукацыі 395 чалавек і 575 — на завочную. На большасці спецыяльнасцяў конкурс адбыўся. Найбольш высокі конкурс быў зафіксаваны на спецыяльнасцях «Пачатковая адукацыя» (завочная скарочаная форма атрымання адукацыі) — 2 чалавекі на месца, «Сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога» (дзённая і завочная формы атрымання адукацыі), «Дашкольная адукацыя» (завочная форма атрымання адукацыі) — 1,7 чалавека на месца. Прахадныя балы на платныя месцы на большасць спецыяльнасцяў склалі больш за 200. Каля 20 абітурыентаў, якія ўдзельнічалі ў конкурсе на платныя месцы, мелі 300 балаў і больш.

У БДПУ з задавальненнем канстатуюць, што з кожным годам якасныя і колькасныя паказчыкі прыёмнай кампаніі паляпшаюцца (не стаў выключэннем і сёлетні год), што сведчыць аб павышэнні цікавасці моладзі да педагагічнай прафесіі.

РЭКОРДЫ І АНТЫРЭКОРДЫ

У БДУ таксама задаволеныя вынікамі прыёмнай кампаніі. На ўсе

Фота bspu.by

формы атрымання вышэйшай адукацыі першай ступені залічана 4657 абітурыентаў. На дзённую бюджэтную форму — 2180 абітурыентаў. Конкурс па ўніверсітэце на бюджэт склаў 1,7 чалавека на месца. Сярод залічаных на дзённую бюджэтную форму навучання па выніках ЦТ 82 працэнты абітурыентаў набралі 300 балаў і больш.

Сярод першакурснікаў БДУ — 78 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд. Без экзаменаў на педагагічныя напрамкі залічана 55 абітурыентаў. Школьных медалістаў і выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія маюць дыплом з адзнакай, — 713 чалавек, а гэта 33 працэнты ад агульнай колькасці прынятых. У залічаных на першы курс — 93 стабальныя вынікі ЦТ, гэта прыкладна чвэрць ад усіх стабальных вынікаў удзельнікаў ЦТ па краіне. Найбольшая колькасць пададзеных у прыёмную камісію БДУ сертыфікатаў з максімальным балам — па матэматыцы (30).

Сярод творчых спецыяльнасцяў самы высокі конкурс склаўся на спецыяльнасці «Дызайн» (напрамак — камунікатыўны дызайн) — 12 чалавек на месца.

Адметнасцю сёлетняй прыёмнай кампаніі ў БДУ стаў аб'яднаны конкурс на групу спецыяльнасцяў. Ён праводзіўся па двух профілях. Першы — «Матэматычныя навукі і інфарматыка»: гэта спецыяльнасці механіка-матэматычнага факультэта, факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і Сумеснага інстытута БДУ і ДПУ — усяго 17 спецыяльнасцяў.

Другі профіль — «Фізічныя навукі»: спецыяльнасці фізічнага факультэта, факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, Сумеснага інстытута БДУ і ДПУ, а таксама Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава БДУ — усяго 11 спецыяльнасцяў.

У заяве, якая падаецца ў прыёмную камісію БДУ, абітурыенты ўказвалі першай прыярытэтную для яго спецыяльнасць, а затым расстаўлялі па прыярытэтах усе астатнія, па якіх праводзіцца агульны конкурс. Абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе на першую згаданую імі спецыяльнасць (напрамак спецыяльнасці), удзельнічалі ў конкурсе на наступныя спецыяльнасці (напрамкі спецыяльнасцяў) з названага імі прыярытэтнага пераліку. Гэта, безумоўна, дае магчымасць укамплектаваць усе спецыяльнасці, а абітурыентам — не застацца за бортам прыёмнай кампаніі.

Высокія прахадныя балы для БДУ — не навіна, а, хутчэй, норма. На сацыяльна-эканамічных і гуманітарных спецыяльнасцях рэкордныя сталі прахадныя балы на «Лінгвакраіназнаўстве» — 385, «Міжнародным праве» — 374, «Міжнародных адносінах» — 377, «Рэгіёназнаўстве» — 368, «Эканамічная інфарматыцы» — 367, «Сусветнай эканоміцы» — 364. Высокія прахадныя балы былі зафіксаваныя і на шэрагу прыродазнаўчых спецыяльнасцяў: «Прыкладная інфарматыка» — 372, «Інфарматыка» — 354, «Біяінжынерыя і біяінфарматыка» — 358.

Але ёсць у БДУ спецыяльнасці, дзе прахадныя балы вельмі сціплыя. Так, каб паступіць на «Рускую філалогію», дастаткова было набраць 213 балаў, а на беларускую — і ўвогуле 188.

На дзённую платную форму ў БДУ было залічана 1564 абітурыенты. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў 1,4 чалавека на месца. Абітурыенты, залічаныя па агульным конкурсе па выніках ЦТ, якія маюць больш за 300 балаў, складаюць 44 працэнты.

Рэйтынг самых высокіх прахадных балаў на платнай форме навучання сярод прыродазнаўчых спецыяльнасцяў: «Біяінжынерыя і біяінфарматыка» — 323, «Хімія лекавых злучэнняў» — 299, «Хімія (навукова-вытворчая дзейнасць)» — 295.

Самыя высокія прахадныя балы сярод сацыяльна-эканамічных і гуманітарных спецыяльнасцяў: «Міжнароднае права» — 341, «Міжнародныя адносіны» — 342, «Лінгвакраіназнаўства» — 320.

А ХТО ІДЗЕ Ў МЕДЫЦЫНУ?

У Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце праблем з запаўненнем і бюджэтных, і платных месцаў традыцыйна не назіраецца. Але калі казаць аб прахадных балах на платнай форме навучання, то яны крыху зменшыліся, што абумоўлена не ў апошнюю чаргу павелічэннем лічбаў набору на навучанне ў бягучым годзе: калі ў 2021 годзе набор на першы курс на бюджэтнай аснове складаў 660 чалавек, то ў 2022 годзе — 720 чалавек. Каб стаць студэнтам-платнікам першага курса лячэбнага факультэта, неабходна было набраць 297 балаў (у 2021-м — 323 балы). Права навучацца на стаматалагічным факультэце атрымалі абітурыенты, якія мелі ў сваім «багажы» 339 балаў (у 2021-м — 343). На дзённым аддзяленні фармацэўтычнага факультэта прахадны бал — 297.

На іншых факультэтах склаліся наступныя прахадныя балы: на педыятрычным — 283 (паўпрахадны — 282), медыка-прафілактычным — 232, фармацэўтычным — 285 балаў (завочная форма платнага навучання).

Пры гэтым максімальныя балы першакурснікаў-платнікаў наступныя. На лячэбным факультэце адлік пачынаўся з 374, на педыятрычным — з 348, медыка-прафілактычным — з 305, стаматалагічным — з 377, на фармацэўтычным факультэце — з 362 (дзённая форма) і 350 балаў (завочная форма). Розніца ў колькасці балаў у тых, хто стаў студэнтам платнай формы навучання, вельмі адчувальная. Відаць па ўсім, хтосьці з маладых людзей з высокімі баламі свядома зрабіў стаўку на платнае навучанне, каб быць потым вольнымі ў выбары месца працы. Калі ж параўноўваць прахадныя балы на бюджэтнай і платнай форме навучання, то і тут розніца адчувальная. На платныя месцы прахадны парог быў на 50—65 балаў ніжэйшы. Дарэчы, у многіх ВНУ назіралася аналагічная тэндэнцыя.

«Высокія прахадныя балы для БДУ — не навіна, а, хутчэй, норма».

Адметнасцю сёлетняй прыёмнай кампаніі ў БДМУ стала пашырэнне мэтавага набору — да 50 працэнтаў ад колькасці бюджэтных месцаў. Упершыню быў зроблены набор студэнтаў-«мэтавікаў» для Мінска — пасля завяршэння навучання яны будуць размеркаваны на першыя працоўныя месцы ў сталіцу (гэта датычыцца спецыяльнасцяў «Лячэбная справа» — 50 месцаў, «Педыятрыя» (40 месцаў) і «Фармацыя» — (4 месцы). Трэба заўважыць, што «мэтавікі» стаматалагічнага факультэта вельмі высока ўзнялі планку: у залежнасці ад рэгіёна, які даваў мэтавае накіраванне, прахадныя балы «мэтавікаў» вар'іраваліся ад 341 да 349. А на фармацэўтычным факультэце «мэтавікі» паказалі прахадныя балы ад 328 да 363.

Да таго ж у БДМУ сёлета ўпершыню адбыўся набор у ваенна-медыцынскі інстытут прадстаўніц жаночага полу (у лік курсантаў залічаны тры дзяўчыны). Яны будуць праходзіць падрыхтоўку ў інтарэсах Узброеных Сіл. Таксама ваенна-медыцынскі інстытут упершыню будзе рыхтаваць ваенных урачоў для Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Раней выпускнікі інстытута ішлі служыць ва Узброеныя Сілы, унутраныя войскі МУС і Дзяржаўны пагранічны камітэт Рэспублікі Беларусь.

Зрэшты, прыёмная кампанія 2022 года, так бы мовіць, ужо стала гісторыяй. З наступнага года яе фармат істотна зменіцца. Як абяцаюць у Міністэрстве адукацыі, з'явяцца ўнутрывузаўскія іспыты.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СКЛАД ДЛЯ ДАЧНІКА

Парады ад практыкаў, як лепш захаваць ураджай на зіму

Наша садаводчае таварыства «Зара» мяняецца. Уладальнікі лецішчаў усё маладзейшыя: гэта альбо спадчыннікі першых гаспадароў, альбо наогул новыя людзі ў СТ. Хтосьці ладзіць вялікую рэканструкцыю, іншыя робяць касметычны рамонт, адны ператвараюць агарод у газон, другія наадварот, парадкуюць градкі. І калі я думаю аб тым, засыпаць ці неяк закансерваваць склеп, то мае новыя суседзі цікавяцца, як прывесці ў парадак падземнае збудаванне, каб захоўваць ураджай. Вось таму мы і зазірнулі да нашых суседзяў — дасведчаных дачнікаў.

Склеп: дзе і як збудаваны

У Міхася Пятровіча, будаўніка на пенсіі, домік даволі сціплы па памерах, затое маюцца два дадатковыя паверхі: на верхнім — больярдная (як толькі зацягнулі?), на ніжнім — склеп. Памяшканне плошчай метраў 16 з земляной падлогай і пабеленымі сценамі. Дзве калоны падпіраюць столь. Традыцыйны адсек для бульбы і шмат стэлажоў з пакуль пустымі пластмасавымі і драўлянымі скрынямі. Саленні-варэнні стаяць упрытык на паліцах. Заўважана варэнне 2020 года, але ўжо поўна слоікаў з лічбай 2022.

— Спачатку будуецца склеп, потым — дом, — тлумачыў Міхаіл Пятровіч. — Хоць ёсць такія ўнікумы, якія робяць наадварот.

— А як гэта на склеп не правальваецца дом?

— Дык арматура спецыяльная, бэлькі. Мансарда таксама не абвальваецца на дом. Тэхналогію трэба ведаць. Звярніце ўвагу: дзве трубы на розным узроўні ў процілеглых сценах. Што гэта, як думаеце?

— Мусіць, вентыляцыя, — дружна адказваем.

— Правільна. Абавязкова павінна быць прытокава-выцяжная.

Падвал суседзяў Таццяны і Андрэя нас не вельмі ўразіў. Яны абсталявалі яго, пашырыўшы яму ў гаражы для аўтамабіля. А гараж — у цокальным паверсе дома. У прынцыпе, усё акуратна ў іх уладкавана, аднак, хутчэй за ўсё, морква і буракі прапахнуць запчасткамі ад аўтамабіля, бензінам.

Наталля Васілеўна на нашай вуліцы лічыцца самай запаслівай гаспадыняй. Пагаласіўшы: «Ой, ну што ж вы ўбачыце ў маім склепе, я яшчэ нічога нарыхтаваць не паспела», дачніца спусцілася ў свой «бункер», лаз, які абсталяваны ў кухні, — гэта камандны пункт, як жартуе яе муж Анатоль Міхайлавіч. Дык вось, склеп суседзяў мае плошчу метраў 12. Пад столлю — драўляныя бэлькі, усё гэта крыху падобна на сярэднявечны замак. Бракуе гакаў, на якія можна было б падвешваць шынкі і каўбасы. На сцяне вісяць шафкі са старога кухоннага гарнітура. У іх — запасы бакалеі і кансерваў, якіх хопіць на ўвесь дачны сезон, а то і больш.

Варэнне, узвары і марынады тут заўважаны яшчэ з леташняга ўраджаю, кожны слоічак падпісаны: што ў ім і год вырабу.

У скрынях для захоўвання морквы і буракоў ужо прыгатаваны чысты і сухі пясок.

У Раісы Сяргееўны склеп таксама немаленькі, размешчаны ў цокальным паверсе дома. У яго можна трапіць з веранды па прыгожай лесвіцы. «Мы ўжо даўно не возім дачную бульбу ў горад, вырошчваем роўна на летні сезон. Гадоў пятнаццаць таму я закручвала слоікаў сто розных загатовак, потым палову з іх раздавала. Цяпер — нічога лішняга, — расказвае

жанчына. — Падвал будзем ператвараць у санвузел. Ужо запрашалі спецыялістаў, яны робяць праект, кажуць, вельмі зручна, што склеп у цокалі».

Без процівагаза насякомых не перамагчы

Пабудаваць склеп — справа няхай і працаёмкая, але аднаразовая. А вось потым пачынаюцца вялікія клопаты. Склеп трэба кожны год чысціць, дэзінфіцыраваць, праветрываць.

Калі паліцы склепа апусцеюць, а сонца прыпячэ, дасведчаныя дачнікі выцягваюць з падполля на святло ўсе дошкі-стэлажы. Іх мыюць мыльным растворам, кажуць, лепш за гаспадарчае мыла нічога не прыдумалі. Потым добра прасушваюць.

І гэта, аказваецца, самая простая работа.

Затым трэба пачысціць сцены і прадэзінфіцыраваць іх. Дачная рада сышлася на думцы, што дэзінфекцыю можна сумясціць з пабелкай. Дадаць у вапнавы раствор меднага купарвасу і пабяліць сцены. Прапорцыі пазначаны на ўпакоўцы гэтых хімікатаў.

«Сярэднявечную» столь Наталля Васілеўна і Анатоль Міхайлавіч апрацоўваюць міксам жалезнага і меднага купарвасу. Гэтым жа растворам паліваюць земляную падлогу. Дарэчы, яны вельмі незадаволеныя, што лаз у склеп абсталяваны ў кухні — праветрываць вельмі нязручна.

Калі яны задумалі аперацыю па знішчэнні нейкіх дробных кузурак, то, прыехаўшы праз некалькі дзён на леціша, у дом забягалі, надзеўшы маскі.

А кузурак знішчалі парамі вапны. Сутнасць аперацыі: вапну заліць вадой і пакінуць у склепе, шчыльна зачыніўшы яго. Праўда, дэзынфектару трэба надзець рэспіратар і ў любым выпадку ў склепе не затрымлівацца. Суседзі заклеілі люк ліпкай стужкай і паехалі дадому. Праз некалькі дзён прыехалі, прыбралі ёмістасць з вапнай, адкрылі склеп і дом для праветрывання.

Як захаваць ураджай

Ганна Іванаўна, жонка Міхаіла Пятровіча, не разумее «гэтай вясковасці» — захоўваць сплеценую ў касу цыбулю ў гарадской кватэры. Яна трымае яе у склепе, папярэдне склаўшы цыбулю ў агароднінныя сеткі, для падвешвання якіх ёсць спецыяльныя кручкі.

Наталля Васілеўна падзяліласа сакрэтам захоўвання часнаку. Мала таго, што суседзі бяруць у яе майстар-клас па марынаванні гэтага прадукту, дык і свежы яна навучыла захоўваць да новага ўраджаю: складсі ў літровыя слоікі і перасыпаць мукой. А вось Ганна Іванаўна часнок захоўвае ў тых жа сетках, толькі папярэдне абпальвае карані запалкай.

Моркву ўсе захоўваюць аднолькава: у скрыні з пяском. А вось з буракамі адзінства не атрымалася: нехта захоўвае разам з бульбай, нехта — у пяску, альбо проста ў скрыні.

Капусту (позняя сарты) лепш за ўсё падвесіць у склепе за ножкі з карэннем. Гарбузы і кабачкі на стэлажах захоўваюцца да новага года. Яблыкі пажадана перасыпаць стружкай. А вось Наталля Васілеўна захоўвае антонаўкі, абгарнуўшы кожны яблык паперай.

Ганна Іванаўна з пятрушкі, кропу і морквы рыхтуе запраўкі для супу. Зяленіва дробна рэжа, моркву здрабняе кухонным камбайнам. Усё змешвае, шчодра соліць. Шчыльна складвае ў сухія стэрылізаваныя слоікі, закрывае поліэтыленавымі вечкамі і захоўвае ў склепе. Сучасная сокавыціскалка дазваляе ёй рабіць запасы хатняга яблычнага соку.

А ў нас на лецішчы захоўваецца сокавыціскалка «Садовая» яшчэ савецкай вытворчасці і цалкам апраўдвае знак якасці. Прычым і суседзі часам просяць пакарыстацца рарытэтам.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

КРЭМНІЕВАЯ ЦУДА-ВАДА

Яе лёгка «прыгатаваць» у хатніх умовах

Мы з сям'ёй жывём у Мінску ў Фрунзенскім раёне. Не сказаў бы, што ваду з-пад крана там піць нельга, але ўсё ж такі без мінімальнай апрацоўкі (хоць бы адстойванне) ужываць яе мы асцерагаемся. Для здаровага харчавання мы карыстаемся не толькі здымнымі фільтрамі, але і актывуем ваду крэмніем. Звычка класці цёмныя каменьчыкі ў вядро з вадой была яшчэ ў маёй бабулі. А днямі я пачуў, што мая блізкая сваячка па матчынай лініі не проста так выконвала старажытны рытуал, а і напраўду ведала таемныя сакрэты вады...

Справа ў тым, што настоеная на кавалках крэменю вада робіцца біялагічна актыўнай, з нейтральнай рэакцыяй, падобнай да плазмы крыві і міжклетачнай вадкасці. Крэмніевая вада мае смак і свежасць крынічнай з крэмніевых парод, чысціню і структуру талай і бактэрыцыдныя ўласцівасці «сярэбранай».

Паводле інфармацыі навукоўцаў, чорны крэмній мелавых парод складае найбольшую цікавасць для лекавых мэт. З чорнага крэмню перадаюцца ў ваду гамеапатычныя дозы злучэнняў двухвокісу крэмнію з вадой, пры гэтым узнікаюць умовы, неабходныя для аднаўлення сістэмы жыццезабеспячэння. Арганічныя рэшткі ў крэмені могуць паскараць акісляльна-аднаўленчыя рэакцыі ў водных растворах нашага цела. Водныя растворы, якія ўзнікаюць вакол крэмнію, дабратворна ўплываюць на арганізм. Цуда-каменьчык бывае цёмна-шэрага колеру (такі крэмній змяшчае ў сабе магній) і чырванаватага (там прысутнічае жалеза).

ЯНА ЗАСЦЕРАГАЛА І ЗАСЦЕРАГАЕ?

Самыя масавыя залежы чорнага і шэрага крэмнію існуюць у Беларусі ў раёне Навагрудскага і Мінскага ўзвышшаў і ў мелавых кар'ерах Брэстчыны. Даследаванні ўзораў цёмна-шэрага крэмнію з кар'ераў Руба, Кабакі і іншых, акрамя галоўнага элемента — крэмнію, паказалі наяўнасць калію, кальцыю, алюмінію, тытану, медзі і цынку. Больш маладыя па ўзросце залежы крэмнію Брэстчыны ўтрымліваюць больш кальцыю і менш жалеза.

Калі ўзяць любы гістарычны перыяд, то мы не знойдзем у Беларусі такіх масавых эпідэмій воспы, чумы, халеры, тыфу, інфекцыйнага гепатыту, якія касілі людзей у суседніх рэгіёнах і краінах. Спецыялісты лічаць, што ў тыя часы нам дапамагала актываваная крэмніем вада, якую нашы продкі бралі ў глыбокіх калодзежах.

ЯНА ДАКЛАДНА НЕ НАШКОДЗІЦЬ

Крэмніевая лячэбная вада ў хатніх умовах робіцца наступным чынам: некалькі каменьчыкаў (чорнага ці цёмнага колеру) трэба пакласці ў трохлітровы слоік з адстоенай сырой або халоднай гатаванай вадой на адны суткі (да сямі дзён).

Ужо праз двое-трое сутак актываванай крэмніем вадой можна мыцца і проста спаталяць смагу. З дапамогай крэмніевай вады аднавіла імунную сістэму адна мая знаёмая. Больш за 20 гадоў таму яна пераехала жыць у сталіцу, у Заводскі раён, дзе вада была не самай лепшай якасці. Ад той штучнай вады «зарабіла» алергію. Ніякія лекі не дапамагалі, а крэмніевая вада выратавала.

Лекар старажытнасці Парацэльс з дапамогай крэмнію лячыў апёкі і глыбокія раны, захворванні нырак і мачавога пузыра, затрымкі мочааддзялення і нават нервовыя расстройствы.

ДЛЯ КВЕТАК І АГУРКОЎ

Сёння ў Беларусі даволі шмат людзей ведае пра гэтыя цуда-камяні і актыўна выкарыстоўвае іх для сваіх патрэб. Асобныя дачнікі паліваюць такой вадой расаду памідораў, якая пры гэтым лепш расце і не хварэе «чорнай ножкай». Лічыцца, што карысна апрацоўваць крэмніевай вадой насенне перад сяўбой. Вынікі ўражваюць: з'яўляюцца амаль 100-працэнтныя ўсходы, да якіх не чапляюцца грыбковыя захворванні. Паспяхова выкарыстоўваецца крэмній і пры кансерваванні. Мае бацькі ў Ляхавічах кладуць кавалачкі крэмнію ў бочачкі пры засолцы агуркоў, каб апошнія не перакісалі. Дома, калі я прыношу жывыя кветкі, жонка ў вазу з вадой абавязкова кладзе невялікі кавалачак крэмнію. Тады кветкі стаяць свежымі некалькі тыдняў. Неверагодна, але факт — камень і кветкам дапамагае.

Сяргей КУРКАЧ.

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже изолированного помещения

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк»

Лот № 1	
Наименование объекта продажи	Изолированное помещение общей площадью 370,9 кв. м с инвентарным номером 410/D-25119, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Советская, 20-2. Земельный участок с кадастровым номером 420850100001008217, площадью 0,3663 га предоставлен ОАО «АСБ Беларусбанк» в постоянное пользование. Целевое назначение земельного участка – для размещения объектов финансового назначения
Начальная цена продажи	307 200,00 (триста семь тысяч двести рублей 00 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 51 200,00 (пятьдесят одна тысяча двести рублей 00 копеек)
Сумма задатка	30 720,00 (тридцать тысяч семьсот двадцать рублей 00 копеек)
Открытый аукцион состоится	**26.09.2022 в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже)**
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, по 15.00 23.09.2022 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»
Дополнительные условия	Объект недвижимости имеет следующие обременения: - часть изолированного помещения (бокс) площадью 50,7 кв. м сдана в аренду; - продаже подлежат следующие объекты основных средств (кондиционер Mitsubishi SRK71HE-S1 (1 штука), кондиционер Cooper Hanter настенная сплит-система (2 штуки) общей стоимостью 337,21 (триста тридцать семь рублей 21 копейка) с учетом НДС по ставке 20 %. Приобретаются победителем аукциона либо единственным участником аукциона на основании отдельно заключенного договора купли-продажи
Контактные данные	По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375 (152) 737326, +375 (1512) 60301, +375(44) 5455954 (А1), +375 (29) 3108228 (А1)
Лот № 2	
Наименование объекта продажи	Капитальное строение общей площадью 226,4 кв. м с инвентарным номером 420/С-60947, расположенное по адресу: Гродненская область, Лидский район, г. Лида, ул. Южный Городок, 21Б. Земельный участок с кадастровым номером 441300000013000653 площадью 0,0819 га предоставлен ОАО «АСБ Беларусбанк» в постоянное пользование. Целевое назначение земельного участка – для размещения объектов финансового назначения
Начальная цена продажи	250 800,00 (двести пятьдесят тысяч восемьсот рублей 00 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 41 800,00 (сорок одна тысяча восемьсот рублей 00 копеек)
Сумма задатка	25 080,00 (двадцать пять тысяч восемьдесят рублей 00 копеек)
Открытый аукцион состоится	**26.09.2022 в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже)**
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, по 15.00 23.09.2022 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»
Дополнительные условия	Объект недвижимости имеет следующие обременения: - часть изолированных помещений площадью 120,8 кв. м сдана в аренду до 01.11.2022; - продаже подлежит следующее прочее имущество: прибор учета тепл. энергии ТЭМ-104-1 (84,96 руб.), регулятор температуры РТМ-02 (10,98 руб.), счетчик электрический 301 BY R33 146 Jaz (37,52 руб.), водомерный узел с фильтром СВХ-15 (8,22 руб.), сигнализация пожарная (702,04 руб.), сигнализация охранная (392,42 руб.). Общая стоимость прочего имущества – 1236,14 (одна тысяча двести тридцать шесть рублей 14 копеек) с учетом НДС по ставке 20 %. Приобретаются победителем аукциона либо единственным участником аукциона на основании отдельно заключенного договора купли-продажи
Контактные данные	По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375 (152) 737326, +375 (154) 611845, +375 (44) 5455954 (А1)

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка до 23.09.2022 на счет № BY69AKBB66708597000020000000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Аукцион проводится при наличии не менее двух допущенных к участию в нем участников. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победителю аукциона задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета аукциона.

Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, аукцион признается несостоявшимся. В данном случае предмет аукциона продается участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

УНП 100325912

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 422/С-40159 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – квасильно-засолочный склад), площадью 302,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Пионерская, 5А (доля в праве 2/5).
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100001000337, площадью 0,0574 га (назначение – для обслуживания квасильно-засолочного склада) по адресу: г. Щучин, ул. Пионерская, 5А (доля в праве 2/5). Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,0574 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0004 га.
Начальная цена продажи лота – 7 800 р. (семьсот тысяч восемьсот рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 780 р. (семьсот восемьдесят рублей)

Продавец – Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26. Тел. (801514) 28-1-50

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 30 августа 2022 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина, 26

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.12.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.
Последний день приема заявлений – 26 августа 2022 г. до 15.00**

Телефон для справок 55-87-71– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Лот 1: капитальное строение, инв. № 420/С-58982 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – здание школы), площадью 125,0 кв. м, расположенное по адресу Лидский р-н, Песковский с/с, аг. Песковцы, ул. Октябрьская, 31.
Лот № 1 находится на земельных участках:
- кадастровый номер 423684603648000018, (назначение – для обслуживания здания школы), площадью 0,2376 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Песковский с/с, а.г. Песковцы, ул. Октябрьская, 31. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли. Виды ограничений (обременений) прав: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0226 га; земли, находящиеся в водоохранных зонах объектов вне прибрежных полос, код – 2 площадь – 0,2376;
- кадастровый номер 423684603648000019 (назначение – для обслуживания здания школы), площадью 0,0656 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Песковский с/с, а. г. Песковцы, ул. Октябрьская, 31. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,0656 га.
Начальная цена продажи – 7 440 р. (семь тысяч четыреста сорок рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 744 (семьсот сорок четыре рубля).

Условия проведения аукциона:
– обязанность по государственной регистрации сделки и перехода прав возлагается на Покупателя, который представляет и оформляет все необходимые документы по государственной регистрации данной сделки и перехода права на объект недвижимости в порядке, установленном законодательством, включая право подачи и подписания заявления на государственную регистрацию от своего имени, а также несет все расходы, связанные с выполнением данного обязательства;
– возмещение Победителем аукциона затрат Продавца на проведение независимой оценки объектов, проданных через аукцион в размере 462 р.;
– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта

Продавец – ОАО «Лидский комбинат бытовых услуг», 231300, г. Лида, ул. Советская, 23а, тел. 8-0154-60-84-01

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Номер р/с для перечисления задатка – BY44-BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 19 сентября 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.09.2022 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.
Последний день приема заявлений – 15 сентября 2022 г. до 15.00**

Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Извещение о проведении электронных торгов	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by
Продавец	ОАО «Сбер Банк», 220005, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by
Предмет электронных торгов	**Начальная цена с НДС 20 %**
Здание банка (Здание специализированное финансового назначения) общей площадью 1 495 кв. м, инвентарный номер 240/С-13688, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Комсомольская, 11А. Составные части и принадлежности: тамбур, подвал, чердак, гараж. **Информация:** При приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона. Состав имущества и цены размещены на сайтах организатора аукциона: www.cpo.by и www.ipmtorgi.by. **Обременение:** аренда	**1 253 755,58** бел. руб. (снижение 10 %)
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 242400000001000572: предоставлен на праве постоянного пользования для Оршанского отделения «Белпромстройбанка» общей площадью 0,0462 га	
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после электронных торгов	
Условия оплаты предмета электронных торгов: не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи	
Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,7 % от цены продажи лота	
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия	
Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 07.07.2022	
Дата и время начала и окончания электронных торгов	Начало торгов – 10.00 **19.09.2022.** Окончание торгов – 12.00 **19.09.2022**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **15.09.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by**

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 420/С-57755 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание оптового склада), площадью 372 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Качана, 1Г;
- капитальное строение, инв. № 420/С-44997 (назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – база МУ), площадью 415,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Качана, 1В;
- капитальное строение, инв. № 420/С-100709 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – площадка с северной стороны оптового склада с подъездной дороги 1-й очереди), площадью 1080,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Качана, площадка с северной стороны оптового склада с подъездной дороги 1-й очереди;
- охранно-пожарная сигнализация оптового склада

Лот № 1 находится на земельном участке, кадастровый № 423650100009000138, площадью 0,4637 га (назначение – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Качана, 1В. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадью 0,0136 га

Начальная цена продажи лота – 142 512 р. (сто сорок две тысячи пятьсот двенадцать рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 14 251 р. (четырнадцать тысяч двести пятьдесят один рубль)

Продавец – Открытое акционерное общество «Лакокраска» г. Лида, 231300, г. Лида, ул. Игнатова, 71, Тел. 8-0154-53-84-30, факс 8-0154-53-85-92

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона: возмещение затрат Продавца на проведение независимой оценки имущества в размере 720,72 р. с учетом НДС; возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 0,6 % от конечной цены продажи объекта.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов. Условия оплаты – по договоренности сторон

Номер р/с для перечисления задатка – Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 29 августа 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 06.04.2022 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.
Последний день приема заявлений – 25 августа 2022 г. до 15.00**

Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ГОУП «Лечебно-производственные (трудовые) мастерские» (УНП 500055202), объявляет о проведении **26.08.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.
Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by**

Нясумнае чытанне

«ДЗІВОСНЫ ПАЛАЦ НА ПАДМУРКУ ЯГО ДЗІВОСНАЙ ДУШЫ»

Літаратурныя героі-акцёры

У літаратуры і тэатра шмат агульнага. Прынамсі, кожны пісьменнік пражывае жыцці сваіх герояў, як акцёр на сцэне... А жыцці саміх людзей тэатра — надзвычай яркі і незвычайны матэрыял. Недарэмна акцёры і актрысы нярэдка самі робяцца героямі літаратурных твораў. Давайце ўспомнім самых яркіх персанажаў беларускай літаратуры, якія ігралі на сцэне.

Гелена Карыцкая: каханне да княжыча

Напэўна, самы прывабны і запамінальны вобраз актрысы стварыў Уладзімір Караткевіч у эпапеі «Каласы пад сярпом тваім». Гелена Карыцкая — прыгонная актрыса тэатра старога князя Данілы Вежы. Юны княжыч Алесь Загорскі бачыць там п'есу «Гарыслава і Людамір»:

«...На сцэну, у доўгім зіхоткім плашчы, выйшла дзяўчына год васемнаццаці. У яе было бледнае аблічча з вялізнымі вачыма. Яны былі большыя, чым ва ўсіх людзей на зямлі...

Алесь не ведаў, што ён прысутнічае пры дзіве, вялікім нават на фоне гэтага добрага тэатра, на фоне выключнай для прыгонных ігры іншых. Ён проста адчуў, як ад першых гукаў яе голасу мурашкі прабеглі па спіне...

...О рабства страшнае!
О лёс мой люты!
Гарчэй за смерць
кайданныя пакуты!
Згасай, згасай
у клетцы залатой
Нікому непатрэбнай сіратой.
Кайданы рабства на руках,
як змеі,
А за мурамі цёплы ветрык вее.
А за мурамі свет!
Сады! Палі!

Голас яе ўпаў, і тут стары князь адчуў, як затрэслася ад рыданняў цельца побач з ім.

— Хлопчык мой!.. Гэта ж выдумка! Хочаш — яна прыйдзе і суцешыць цябе?

— Не! Не! — і невядома было, ці ён не хоча, каб яго суцешалі, ці проста не верыць, што гэта выдумка».

Дзед, убачыўшы, наколькі ўнук уражаны талентам актрысы, вырашыў зрабіць яму падарунак: даў Гелене «вольную», якую Алесь ёй і ўручыў.

Гелена Карыцкая на ўсё жыццё засталася ўдзячнай гэтаму хлопчыку... І калі ён, падросшы, не ведаў, як далей жыць, калі яго кінула любая Майка, Гелена прыйшла да яго і аддала сваё каханне, нічога не просячы наўзамен, бо ён «мой першы і апошні». Нарадзіла ад Алеся блізнюкоў... Рашуча адмовілася, калі прапанаваў шлюб, больш за тое — памірыла з Майкай.

Гелену запрашаюць на работу і сам Шчэпкін, і французская трупа... Караткевіч не паспеў дапісаць эпапею, і мы не ведаем, як склаўся далейшы лёс Гелены Карыцкай. Але, цалкам магчыма, яна спрыяла б узнікненню першых беларускіх спектакляў, бо разважае: *«Чаму ў п'есах няма звычайных людзей, якія вакол? Мужыкоў у хаце, вячорак на пакрой, вяселляў, сварак, сконаў? Чаму няма мяшчан, паноў, корчмаў? Чаму на сцэне рухаюцца quasi-іспанцы і на кожным кроку грыміць гром? Хіба такі бедны на трагізм і на смешнае гэты край? У чым прычына?»*

Салавей: кашэчы канцэрт

А самы вядомы артыст беларускай літаратуры — прыгонны хлопец Салавей з аповесці Змітрака Бядулі. Праўда, артыст ён, так бы мовіць, арыгінальнага жанру — пераймае галасы людзей, жывёлін, птушак... Асабліва паны любяць слухаць у ягоным выкананні спевы салаўя.

Але аднойчы Салаўю давялося выканаць незвычайную ролю... Пан Вашамірскі ўзяў яго ў госці да сваёй маці, пабожнай верніцы, надзвычай жорсткай з прыгоннымі... А яшчэ вялікай аматаркі катоў.

«— Я прызнаю мастацтва толькі ў катоў, — казала пані і пагладзіла пры гэтым двух катоў, якія сядзелі на яе каленях.

— Ану, заняўкай! — звярнуўся пан Вашамірскі да Салаўя і бліснуў весела вачыма.

Салавей пачаў няўкаць.

Кашачыя марцаўскія спевы ліліся з яго горла, запоўнілі пакой. Ён на розныя лады перадаў няўканне катоў. Няўкаў нібы не адзін кот, а дзесяць. У гэтых агідных галасах чулася роспач, быццам рэзалі кагосьці па горлу тупым шклом ці душылі вяроўкай. У гэтых жудасных хрыпах і стогнах была цяга самца да самкі, тая цяга, ад якой непрытомнымі робяцца, ідуць на розныя злоўчынкі.

Пан заткнуў вушы.

Уся чэлядзь збеглася спалоханая і здзіўленая. У пансіёне катоў пачалося занепакоенне. Каты пачалі драпаць дзверы.

Старая пані была ў захапленні. У яе засвяціліся вочы, як дзве свечкі, паружавеў твар. Яна не адрывала вачэй ад Салаўя, упівалася са смагай у гэты дзікі канцэрт. Ёй здавалася, нібы чуе гранне аргану ў касцёле або спевы анёлаў у раі, што былі ёй знаёмы з яе ўласных «прарочых сноў», якія часта сніла...

— Вось гэта мастацтва! — казала пані горача і шчыра. — Вось гэта я разумею! Адно захапленне...

— Ага! — крыкнуў пан Вашамірскі голасам пераможцы. — Ага!

Вельмі хацелася ў гэты час пані Вашамірскай загадаць Салаўю пацерабіць ёй пятку...»

Пелагея Азарэвіч: жывая статуя

Кніга Уладзіміра Мехава «Старадаўняя гравюра» заснаваная на рэальных падзеях. Таемны радца, знакаміты паэт Гаўрыіл Дзяржавін едзе інспектаваць шклоўскія ўладанні былога фаварыта расійскай імператрыцы графа Зорыча — той гуляка, карцёжнік, даўгоў нарабіў... Мы сустракаемся з сакратаром графа Зорыча — італьянцам Жывакіні: *«Прыроджаны камедыянт ён, гэты Жывакіні. Дзяржавін ведае і любіць яго даўно. У Пецярбургу, калі прывозіць ён ліст ці прэзент ад гаспадара, заўсёды гутарыць з ім, смяецца над яго выдумкамі, над пацешнай манерай расцягваць словы».*

Дзяржавіну паказваюць балет знакамітага тэатра Зорыча «Пакінутая Дыдона»:

«Яна была асабліва добрая, Дыдона. Фатальная багіня і царыца з высока паднятымі, перахопленымі алмазным абручом валасамі, у лёгкім блакітным уборы, які воблакам ахутваў нібы з мармуру высечаны твар, яна прама на вачах апускалася з нябёсаў на зямлю, ператваралася ў звычайную жанчыну, палымяную і ўпрыгожаную непадзеленым пачуццём. У дуэце з Энеем, Божа ўсемагутны, якой станавілася яна то непрыступнай, то вабнай, усёдаравальнай. А твар, як шмат выказваў яе твар — пяшчоту, адчай, надзею, прагу помсты, гнеў, зноў пяшчоту і надзею... І ўсё гэта — халопка, якая б і сёння круціла каровам хвасты, калі б ці то самім Зорычам, ці то кім з яго памочнікаў не была выпадкова заўважана?»

Так мы знаёмімся з зоркай шклоўскага прыгоннага тэатра — Пелагеяй Азарэвіч. Яе, як і ейную таленавітую пляменніцу Кацярыну Азарэвіч, узялі ў тэатр з вёскі. Жорсткая муштра абазначыла іх таленты... Граф выкарыстоўвае прыгажуню Пелагею, як заманеца. То яна мусіць выяўляць у паўгаголеным выглядзе ў парку жывую статую для ўцехі гасцей. То граф вымушае яе прыходзіць у багатым уборы на баль, каб падняць на смех таго, хто будзе заляцацца да чароўнай незнаёмкі, не ведаючы, што яна — мужычка. Сведкам такога розыгрышу становіцца Дзяржавін... У выніку граф Зорыч загадвае Пелагеі правесці ноч з госцем, які прыняў яе за важную даму. Але ў Пелагеі ёсць абаронца — сакратар Жывакіні закаханы ў яе без памяці... Толькі ўсё, што ён можа, — варта ваць дзверы яе пакоя.

Умешваецца Дзяржавін, і па распараджэнні графа адбываецца вяселле Жывакіні і Пелагеі...

«А далей сумны блазан Зорыча пераедзе ў Маскву, махне рукой на мастачныя памкненні маладосці, стане сціплым макаронным фабрыкантам — дзякуй богу, у макаронах ведаў толк заўсёды. Яго жонка паступіць тут на сцэну, будзе заўважана, прынята публікай, і аб дзіўнай яе пластыцы, скульптурнасці, аб постаці, нібы высечанай з мармуру, знаўцы будуць казаць, што ўсё гэта — з прыгоннага яе мінулага, з часоў, калі застывала яна жывой статуяй. ...А яшчэ пазней, пры наступным пакаленні публікі, гонарам не адной Масквы — усёй Расіі стане новы Жывакіні, Васіль Ігнатавіч, выбітны акцёр Малога тэатра, улюбёнец Гогаля і Астроўскага, «светлы комік», як назавуць яго газеты. Яго пацешная манера расцягваць словы, рабіць няправільныя націскі будзе замілоўваць, чапаць, захапляць гледачоў. Аднак мала хто, хіба толькі самыя блізкія, будзе ведаць, у каго гэтую манеру-маску, можа, і неўсвядомлена, артыст пераняў...»

Алаіза Пашкевіч: падмосткі на кірмашы

Адной з актрыс беларускай трупы Ігната Буйніцкага была Алаіза Пашкевіч, якую мы ведаем пад псеўданімам Цётка. Пра яе напісала раман «Крыж міласэрнасці» Валянціна Коўтун.

«Адукаваная жанчына, якая вучылася ў Вільні, Пецярбургу, Львове, Кракаве, улюбёна слухала высокія тоны голасу знакамітых прымадонн і шліфавала сваё артыстычнае прызванне (прырода дала і гэта). Ты потым дзівілася сама сабе ў звычайным гарадзенскім мястэчку, куды нарэшце даставалася з аматарскай трупай. Ставілі «У зімовую ноч» Ажэшкі. На імправізаванай сцэне, Табе, Крапівісе (людзі чамусьці заўсёды бачылі Цябе старэйшую за гады), амаль пасля кожнага спектакля вясёлы прыгажун Ігнат Буйніцкі заклапочана клаў на разгарачаны лоб халодную руку. І ты падала ў забыцці кароткага адпачынку перад новаю дарогай, і ўяўны смуглаваты гандальер з Венецыі ўсміхаўся да цябе жоўтымі зубамі, размашыста падымаючы над каналам доўгае вясло».

У рамане апісваецца, як юная Алаіза бярэ ўдзел у спектаклі па рамане Элізы Ажэшкі «Хам» у вучэльні Прозаравай, дзе ёй дастаецца роля Франкі, як бачыць на мастачковым кірмашы прадстаўленне «Пінскай шляхты»:

«Хлопец падняў уверх правую руку, выкарыстаўшы хвіліну замяшання, і, паспешліва, глытаючы словы, залапатаў звонкім прыгожым голасам:

Дзе ўнадзіцца юрыста,
Вымяце хату дачыста.
Такіх дзіваў натворыць,
Такіх кручкоў нагаворыць...

Хлопец ужо супакоіўся і чытаў верш больш стрымана, павольна.

Як гэта проста, аказваецца... Не па-расейску, не па-польску. А вось чытае ж ён па-свойму, той самай гаворкаю, на якой... У сваіх жа вёсках...

А людзі слухаюць. Слухаюць вершык, напісаны па-мужыцку! Слухаюць тое, што яна душыць у сабе ўсе гэтыя бясконцыя гады, а яно ўсё роўна вырываецца і амаль даводзіць яе да бясцямнасці. Так доўга яна душыла ў сабе т о е, што яно і само ўжо зняверылася, збаялася і спакутавалася, — і накіпае ў душы і ў галаве хіба толькі разам з пякучым болем».

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч: гульня са смерцю

Па п'есе Алеся Асташонка «Камедыянт, ці Узнёсласць сумнай надзеі. Калядны фарс у дзвюх дзеях», быў зняты фільм «Камедыянт». Галоўны герой — Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, які не толькі пісаў вершы, паэмы і п'есы, але і сам выступаў у якасці рэжысёра і артыста.

Дзеянне адбываецца на Каляды. Тут і сяляне-калядоўшчыкі, якія прыходзяць да пана, і прадстаўленне хатняга тэатра... І цень Камілы — дачкі, сасланай у Сібір... А тут яшчэ з'яўляецца паранены сябар Камілы, збеглы катаржнік. Дунін-Марцінкевіч мусіць хаваць яго, а вось і жандары панаехалі, высвятляць, «чым абязаны ізлішняму скапленню прастанароддзя»... Паэт і сам толькі з турмы, пад наглядам. Даводзіцца ператвараць усё ў відачынства, гульню... Каб выжыць — трэба надзяваць маску.

«— Вы бачылі, як адыходзілі сяляне? Якія яны былі сумныя?

— Татачка, яны ж смяяліся.

— Пад каляднай маскай я таксама смяюся, але мне сумна. Божа, які ж пакутны наш народ».

Заканчваецца спектакль словамі: *«Мы змагаемся за веліч і чысціню нашага народа, народа, якому мы яшчэ збудуем палац — тэатр — дзівосны палац на падмурку яго дзівоснай душы».*

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Гісторыя сяброўства

МАСКОЎСКІ ВЕЧАР

Жывыя сустрэчы з пісьменнікамі, а значыць, і з мастацкім словам, — заўсёды больш шматзначныя, чым знаёмства толькі з кнігай, з публікацыяй. Сёння традыцыя праведзення паэтычных вечароў амаль згубілася. Так, імпрэзы ў бібліятэках і школах, часам у кнігарнях, яшчэ ладзяцца. А вось вялікія паэтычныя, творчыя вечарыны, калі і залы былі запоўненыя сотнямі чытачоў, слухачоў, калі і тэлебачанне вяло трансляцыі такіх сустрэч пісьменніка з прыхільнікамі яго таленту, здаецца, сышлі на нішто. Што ўжо казаць пра прадстаўленне нацыянальных літаратур, напрыклад, у Расіі, у Маскве...

Ранейшая ўвага да падобнага характару імпрэз прыжывае. Як прыклад — напамін пра сакавіцкі вечар беларускай літаратуры ў 1977 годзе ў Маскве... 5 сакавіка 1977 г. першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Пятровіч Шамякін звярнаецца да сакратара ЦК КП Беларусі Аляксандра Трыфанавіча Кузьміна... *«Паважаны Аляксандр Трыфанавіч! — чытаем у звароце аднаго з кіраўнікоў творчага саюза. — Па ініцыятыве Цэнтральнага дома літаратара імя Фадзеева, ухваленай сакратарыятам СП СССР, 21 сакавіка г.г. у Маскве ў памяшканні ЦДЛ праводзіцца вечар беларускай літаратуры. Плануецца ён як мерапрыемства, прысвечанае 60-годдзю Кастрычніка.*

Сакратарыят СП БССР разгледзеў пытанне аб вечары і вырашыў паслаць для ўдзелу ў ім групу пісьменнікаў у наступным складзе: І. Шамякіна, А. Куляшова, А. Петрашкевіча, В. Быкава, А. Макаёнка, А. Вярцінскага, Н. Гілевіча, І. Навуменкі, В. Вярбы, І. Сіпакова, П. Макаля...» Пагадзіцеся, калі зазірнуць у гісторыю беларускай літаратуры 1970-х гг., склад дэлегацыі прадстаўнічы. Магчыма, тут не хапае Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Петруся Броўкі, Івана Чыгрынава, Вячаслава Адамчыка, каго з маладзейшых на той час... Але ж і прычыны маглі быць розныя. У тым ліку — і хваробы, пэўная занятасць іншымі клопатамі...

Чытаем далей у звароце Івана Пятровіча: *«... Мяркуецца таксама, што ў вечары прымуць удзел прадстаўнікі кіраўніцтва СП СССР, члены Савета па беларускай літаратуры, перакладчыкі, а іменна: Р. Казакова (магчыма, будзе весці вечар), Ю. Сураўцаў, Я. Хялемскі, А. Аўчарэнка, М. Гарбачоў, А. Вазнясенскі, Б. Слуцкі, І. Бурсаў, Г. Куранёў, В. Карчагін, С. Кошачкін».* Таксама даволі пераканаўчы склад сябрыны, якая дапаможа беларускім літаратарам усталяваць добры кантакт з маскоўскай аўдыторыяй. Згаданыя пісьменнікі ці як перакладчыкі, ці як літаратуразнаўцы, літаратурныя крытыкі трымалі свет беларускай нацыянальнай літаратуры ў полі свайго зроку, спрыялі пашырэнню звестак пра беларускую паэзію і прозу ў Расіі, на рускай мове.

З ліста І. Шамякіна — пра аргументацыю, вартасці падобнай вечарыны: *«Беларускія пісьменнікі параўнаўча даўно не трымалі творчай справаздачы перад працоўнымі Масквы. Хацелася б, каб наш вечар атрымаў належны грамадскі рэзананс. Для гэтага патрабуецца, акрамя літаратурнага выступлення, яшчэ і мастацкая частка. І мы прасілі б Вас аказаць тут нам садзеянне і даць адпаведнае ўказанне міністэрству культуры наконт канцэрта, а лепей — наконт удзелу ў вечары ансамбля «Песняры».*

Загадзя ўдзячны!..»

Такое вось кароткае і вельмі важкае пісьмо.

Загадчык аддзела культуры ЦК КП Беларусі выкладае сакратару ЦК А. Т. Кузьміну пазіцыю ў сваёй дакладной запісцы — ужо па выніках вечара (дакладная запіска датавана 4 красавіка 1977 г.): *«У ЦК КПБ паступіў зварот СП БССР аб правядзенні 21 сакавіка г.г. у Маскве ў памяшканні Цэнтральнага дома літаратараў вечара беларускай літаратуры.*

Пісьмо разгледжана аддзелам. Для ўдзелу ў вечары кіраўніцтву Саюза пісьменнікаў было рэкамендавана накіраваць групу вядучых пісьменнікаў рэспублікі, у ліку якіх народныя паэты Беларусі П. Броўка, А. Куляшоў, пісьменнікі А. Макаёнак, І. Навуменка і іншыя, а таксама групу артыстаў і дэкламатараў.

Вечар прайшоў згодна распрацаванаму плану».

Як бачыце, была і карэкціроўка складу дэлегацыі, што само па сабе нядрэнна. І вечар, відавочна, прайшоў як мае быць. У любым выпадку, маскоўская паездка на некаторы час засталася ў памяці беларускіх пісьменнікаў.

Несумненна, зазірнуўшы ў дні даўно мінулыя, такую практыку варта было б узнавіць, тым больш што ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі працуе выдатны дзелавы і культурны комплекс, дзе ёсць месца, прастора і для імпрэз, і для выставак, для самых шырокіх сустрэч. Будзем спадзявацца — знойдзецца магчымасць зладзіць там і творчую справаздачу беларускіх паэтаў перад маскоўскімі аматарамі мастацкага слова... Падаецца, што гэта будзе на карысць не толькі прыгожаму пісьменству...

Кастусь ЛЕШНІЦА.

НАМ ЗАСТАЕЦЦА СПАДЧЫНА

Чарговы транш з фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва выдзелены пяці аб'ектам Брэсцкай і Гродзенскай абласцей

Адпаведнае распараджэнне прынята на мінулым тыдні. Згодна з ім, на рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы выдзелена амаль тры мільёны рублёў. З іх 300 тысяч будуць накіраваны на сядзібна-паркавы ансамбль у вёсцы Закозель Драгічынскага раёна, дзе будзе праведзена рэстаўрацыя капліцы, і каля мільёна рублёў — на палацавы комплекс у г. п. Ружаны Пружанскага раёна. Тут плануецца правесці кансервацыю з элементамі рэстаўрацыі фрагментаў галоўнага корпуса і аркад. Большая частка сродкаў размеркавана паміж трыма аб'ектамі Гродзеншыны — Гальшанскім замкам, былым палацам Агінскіх і царквой-крэпасцю ў вёсцы Мураванка. Ва ўпраўленні культуры Гродзенскага аблвыканкама пракаментавалі распараджэнне і расказалі аб тым, што сёння адбываецца на згаданых аб'ектах.

Гродзенцы прадставілі на разгляд савета фонду тыя гісторыка-культурныя аб'екты, на якіх вядуцца работы па іх аднаўленні. Пры гэтым усе яны дзейнічаюць і карыстаюцца шырокай папулярнасцю сярод турыстаў.

— Менавіта дзякуючы фонду паступова аднаўляецца Гальшанскі замак. У маі мінулага года пачала дзейнічаць экспазіцыя на ўсіх чатырох узроўнях адбудаванай Паўночнай вежы. Пачатак работ і іх працяг стаў магчымы пры падтрымцы фонду, сродкі якога выдзяляліся некалькі разоў. Чарговы транш на 2022 год таксама даволі значны — адзін мільён рублёў. Ён прадугледжаны на кансервацыю з рэстаўрацыяй і выкарыстанне руін былога замка Сапегаў на паўночна-ўсходнім корпусе. Сродкі паступяць на баланс Ашмянскага райвыканкама, — расказала **намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Сняжана КУРАТЧЫК.**

Трэба сказаць, што замак, які быў пабудаваны ў XVII стагоддзі, да нашых дзён дайшоў у выглядзе руін і рэшткаў старадаўніх сцен і вежаў. У 2010 годзе іх кансервавалі, а ў 2017-м пачалася рэстаўрацыя замка. За гэты час была адноўлена Паўночная вежа, створана музейная экспазіцыя з каштоўнымі артэфактамі, знойдзенымі падчас археалагічных раскопак. Склепавыя памяшканні прысвечаны міфам і легендам Ашмянскага краю і Гальшанскага замка. На верхнім ярусе вежы знаходзіцца глядзельная пляцоўка і макет замка ў розныя часы, а таксама партрэты яго ўладальнікаў. Вакол замка з'явіліся інфармацыйная і гандлёвая інфраструктуры. Тут штогод ладзяцца фестывалі сярэднявечнай культуры «Гальшанскі замак». Чарговы, XI фэст з насычанай праграмай прайшоў каля сцен замка ў першую суботу жніўня. Дзякуючы рэстаўрацыі гісторыка-культурны аб'ект становіцца ўсё больш папулярны сярод турыстаў.

— Работы на Гальшанскім замку працягваюцца. Разам з тым аб'ект працуе і прымае наведвальнікаў. Крыху больш чым за год тут пабывала больш за 17 тысяч турыстаў, праведзена 430 экскурсій, — адзначыла Сняжана Куратчык.

Другім аб'ектам, які таксама трапіў у спіс на прэзідэнцкі транш, стаў былы палац Агінскіх у вёсцы Залессе Смаргонскага раёна. Каменны палац пабудаваны адным з яго знакамітых гаспадароў, вядомым кампазітарам Міхалам Клеафасам Агінскім, аўтарам вядомага паланэза «Развітанне з Радзімай». Яго рэзідэнцыя мела цэлы комплекс пабудоў. Тут была багатая на экзатычныя расліны аранжарэя, вадзяны млын, вялікая цяпліца, за сядзібай быў разбіты англійскі парк. У розных яго кутках знаходзіліся альтанкі і так званыя антычныя храмы, адзін з якіх захаваўся да сённяшніх дзён.

Пяць гадоў таму паркавы комплекс пачаў аднаўляцца. Па ўзорах праекта XIX стагоддзя пабудавана Кітайская альтанка. Акрамя таго, у самых маляўнічых месцах парку з'явіліся гарбатыя мосцікі і садовыя канапы.

Сёння былая сядзіба Агінскіх складае музейны комплекс з 13 залаві, дзе можна цікава і змястоўна адпачыць. Напрыклад, узяць удзел у экскурсіях і квэстах, атрымаць майстар-клас па танцах, пакатацца па дворыку ў коннай карэце, нават пераначаваць у гасцінічных нумарах дома-музея.

Сродкі, якія заяўлены гродзенцамі для палаца Агінскіх, будуць накіраваны на рэстаўрацыю былога будынка стайні. Паколькі музей мае сваіх коней, новая стайня вырашыць праблему іх утрымання. Пакуль яны месцяцца на арандаваных плошчах. Між тым, папулярнасць катання ў коннай карэце сярод наведвальнікаў расце. На работы па рэстаўрацыі стайні Смаргонскаму райвыканкаму выдзелена 130 тысяч рублёў.

— Усе аб'екты разглядаліся з пункту гледжання іх эканамічнай аддачы, — патлумачыла прадстаўнік упраўлення культуры. — Напрыклад, Гальшанскі замак з пачатку года меў даход у памеры амаль 27 тысяч рублёў. Яшчэ большы прыбытак у палаца Агінскіх, які прапануе сваім наведвальнікам да 25 відаў самых розных паслуг.

Часта на сядзібе праводзяцца масавыя мерапрыемствы. Найбліжэйшае свята пад назвай «Вяргіневы баль» адбудзецца 20 жніўня і прымеркавана да дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага.

У спісе на рэстаўрацыю і ўнікальны аб'ект 1524 года будавання — Свята-Раства-Багародзіцкая царква-крэпасць у вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна. Яна больш вядомая па назве вёскі.

Будаваўся тагачасны храм не толькі дзеля малітваў. Магутная пабудова з вокнамі-байніцамі, тоўстымі сценамі, круглымі вежамі і вінтавымі лесвіцамі мела важнае абарончае значэнне. Тут шукалі прытулак месцічы падчас знішчальных набегаў, якіх на той час было нямала. Галоўны ўваход абаранялі масіўныя ўваходныя вароты, якія апускаліся на ланцугах з нішы ў сцяне. Дарэчы, яшчэ ў пачатку XX стагоддзя аб іх ёсць звесткі, але праз некаторы час вароты зніклі.

Царква нямала пацярпела падчас шведска-рускай вайны, калі войскі шведскага караля Карла XII бамбардзіравалі яе.

Доўгі час храм быў у запусценні, аб чым нават зроблены запіс у інвентары 1804 года. У другой палове XIX стагоддзя Мураванскую царкву адрамантавалі і часткова перабудавалі. Некаторы час яна не працавала, яе адкрылі для прыхаджан у 1989 годзе.

Царква ў Мураванцы — адна з самых вядомых і старажытных святыняў у Беларусі. Яна з ліку нямногіх аб'ектаў, уключаных у папярэдні спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Згодна з распараджэннем па выдаткаванні сродкаў фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва, на Мураванскай царкве запланавана правядзенне бягучага рамонту даху і фасадаў. Работы будуць весціся ў адпаведнасці са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі «0», якая лічыцца самай ахоўнай. На рамонт выдаткавана 550 тысяч рублёў.

— Наконт царквы ў Мураванцы, гэта была ініцыятыва Шчучынскага райвыканкама, мясцовыя ўлады падтрымалі просьбу прыхода па выдзяленні сродкаў. Іх фонд выдзяляе ў адпаведнасці з праектнай дакументацыяй, відамі і праграмай работ, якія ўзгоднены з Міністэрствам культуры. Прадстаўнікі ведамства выязджалі на аб'екты, вывучалі і ацэньвалі бягучыю сітуацыю. Дарэчы, па ўсіх аб'ектах плануюцца вялікія аб'ёмы работ, адпаведна, і сродкі выдзелены даволі значныя, — падкрэсліла Сняжана Куратчык.

У далейшым гродзенцы маюць намер падаваць заяўкі ў фонд па падтрымцы культуры і мастацтва з мэтай паскорыць ход работ на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны. Значных укладанняў патрабуе той жа Гальшанскі замак, а таксама Крэўскі замак (які, дарэчы, раней атрымаў транш на кансервацыю вежы). Ёсць праект па аднаўленні былой загараднай сядзібы графаў Пуслоўскіх «Альберцін», што ў Слоніме. У комплекс увайшлі двухпавярховы асабняк, а таксама флігель, стайня, пейзажны парк і возера — месца адпачынку гараджан.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота Упраўлення культуры аблвыканкама.

Несці гістарычную

Пятага жніўня вядомаму беларускаму архівісту, гісторыку, літаратуразнаўцу, публіцысту Віталю Скалабану споўнілася б 75 гадоў. І ўжо 11 гадоў, як яго няма.

У Нацыянальным архіве Беларусі, дзе даследчык працаваў доўгія гады, адбылася вечарына памяці, на якую сабраліся калегі, сябры і сваякі Віталя Скалабана.

Усе адзначалі шматграннасць таленту Віталя Уладзіміравіча: ён пакінуў значны след шмат у якіх адгалінаваннях гістарычнай навукі, адкрыў шмат імёнаў і дакументаў, даследаваў гісторыю беларускай дзяржаўнасці. Сярод яго творчай спадчыны — і зборнікі дакументаў «Купала і Колас, вы нас гадавалі...», і даследаванні пра Мітрафана Доўнар-Запольскага, Мікалая Улашчыка, Максіма Гарэцкага, Усевалада Ігнатоўскага ды іншых, краязнаўчыя работы пра родную Ляхаўшчыну, шматлікія сцэнарыі дакументальных фільмаў, артыкулы і нават п'есы. Гісторык Святаслаў Кулінок, што сёння ўзначальвае аддзел публікацый Нацыянальнага архіва, якім загадваў Віталь Скалабан, расказаў, як яго, яшчэ маладога спецыяліста, уразіла фантастычная эрудыцыя Віталя Уладзіміравіча. Той мог грунтоўна адказаць на любое пытанне, звязанае з гісторыяй і культурай Беларусі XX стагоддзя. Святаслаў Кулінок падкрэсліў, што Віталь Скалабан пакінуў глыбокі след у публікацыйным кірунку архіўнай службы, залажыў асновы сучаснай публікацыйнай дзейнасці.

Прысутных узрадавала вестка, што цяпер у Нацыянальным архіве штогод у лістападзе будуць праводзіцца Скалабанаўскія чытанні. У сувязі з тым, што сфера навуковых зацікаўленняў Віталя Скалабана была вельмі шырокая, Скалабанаўскія чытанні дадуць магчымаць закранаць самыя розныя аспекты. Святаслаў Кулінок удакладніў: паколькі Скалабан займаўся і канфесіянальнай гісторыяй Беларусі, напрыклад, быў датычны да стварэння зборніка дакументаў «Праваслаўная царква на Віцебшчыне», першыя Скалабанаўскія чытанні пройдуць па тэме «Беларуская праваслаўная царква ў БССР у 1920—30-х. Дакументальныя крыніцы і іх інтэрпрэтацыя».

Вячаслаў Селяменеў, які быў дырэктарам Нацыянальнага архіва ў той час, калі там працаваў Віталь Скалабан, успомніў, як з'явілася серыя тэлевізійных дакументальных фільмаў «Адкрыты архіў» і «Зваротны адлік», і Віталь

Смачна есці!

ДРАНІКІ ЯК ШЭДЭЎР

ГАВОРЫМ АБ РЭГІЯНАЛЬНАЙ КУХНІ ПАЛЕССЯ З КУХАРАМ, ЯКІ БОЛЬШ ЗА 20 ГАДОЎ ГАТУЕ ПА «БАБУЛІНЫХ» РЭЦЭПТАХ

Складаныя спалучэнні прадуктаў, нязвыклыя смак і тэкстура — далёка не заўсёды людзі прыходзяць у рэстаран менавіта па гэта. Часам хочацца... проста паесці — каб былі вялікія порцыі, сытна, не вельмі дорага, а, галоўнае — смачна.

Кажуць, каб паспяваць за модным трэндамі, дастаткова дастаць бабулін куфар, перавярнуць яго змесціва, каб ніжні пласт апынуўся зверху — і атрымаеш найноўшыя тэндэнцыі. Заўсёды вяртаецца і мода ў кулінарыі: сёння кулінарныя трэнды — здавалася б, даўно і трывала забытыя крупы і каранеплоды (ячныя, грэчка, якая-небудзь напаўміфічная полба, рэпа, корань пятрушкі і сельдэрэю). У рэстаранах карыстаюцца павагай простыя прадукты, дыетолагі кажуць пра карысць мясцовых страў, а вядомыя кухары — актыўна адраджаюць нават не наогул нацыянальную, а мясцовую, рэгіянальную кухню.

Зрэшты, **кухар кафэ «Хата палешука» Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Андрэй НІСТРАТАЎ** вывучаць і гатаваць стравы палескай кухні пачаў задоўга да таго, як цікавасць да рэгіянальных кулінарных традыцый стала мэйнстрымам.

— Я тут, можна сказаць, старажыл — працую ў «Хаце палешука» ўжо 21 год. У нас практычна ўся каманда — кухары старой загартоўкі. Шэф-кухар наш таксама больш за 20 гадоў працуе.

«Хата плешука» спецыялізуецца на палескай кухні — хатняй, «як у бабулі ў вёсцы». Сучасная дыеталогія сцвярджае, што чалавечы арганізм запраграмаваны на ўжыванне пэўных прадуктаў харчавання. Пакаштаваць, вядома, можна ўсё, але аснову рацыёну павінны складаць традыцыйныя для нашай культуры стравы. Можна прывесці прыклады, калі ў людзей, якія з'ехалі на сталае месца жыхарства ў краіну з іншай культурай харчавання, развіваліся захворванні з прычыны адсутнасці ў рацыёне пэўных прадуктаў, да якіх генетычна адаптаваны іх арганізм. Але справа нават не ў гэтым: Андрэй кажа, выбар яго «творчага шляху» вызначыла тое, што ён сам любіць аўтэнтычную кухню Палесся.

— Мне здаецца, для кухара важна, каб ён сам любіў тую кухню, стравы якой гатуе, каб тое, што ён гатуе, яму хацелася з'есці, — усміхаецца суразмоўнік. — Асабіста я просты ў ежы — люблю смажаную бульбу з халодным малаком, сезонныя варэнікі — цяпер вось з чарніцамі і вішнямі. Гатую іх дома, для сваёй сям'і,

Дранікі, на якія аматары едуць часам за сотні кіламетраў. І запэўніваюць, што страва таго вартая.

і дакладна гэтак жа — на рабоце, для нашых гасцей. Вару суп з капусты так, як тое рабіла мая бабуля. Яна, дарэчы, была выдатным кулінарам. Вельмі смачна гатуюць і мама, і сястра. Мне таксама з дзяцінства падабалася «праяўляць крэатыў» у рэчышчы стварэння страў. Памятаю, дапамагаў бабулі пячы пірагі, і мне тое было нават цікавей, чым гуляць з сябрамі. Таму і паступіў пасля школы вучыцца на кухара.

Цяпер многія ідуць у сушысты, піцэры, разважае Андрэй.

— Я ўмею ўсё гэта гатаваць. Піца ёсць у нашым меню, сушы часам рабіў дома. Але ўсё гэта не маё. Я аматар хатняй, старой палескай кухні.

Старадаўнія стравы заўсёды «павольныя»

Беларуская кухня ўвабрала ў сябе мноства рэцэптаў розных еўрапейскіх краін. Напрыклад, знакамітая верашчака (від мачанкі да бліноў і дранікаў) — гэта французска-беларуская страва. Першапачаткова яна гатавалася на вострым піўным булёне з белых нямецкіх каўбасак. А першы яе рэцэпт беларускія кухмайстры ўзялі з французскай кухні (са старадаўняга ўжо на той момант кулінарнага зборніка) і адаптавалі пад густы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага. Ёсць у беларускай кухні і лазанкі — варыяцыя на тэму лазанні. Рэцэпт прывезлі італьянцы пры каралеве Боне Сфорцы, а беларускія кухары — зноў жа, адаптавалі пад айчынныя смакавыя перавагі (у рэцэпт лазанак уваходзіць вэнджаная грудзінка і баравікі).

А калі казаць аб кухні Палесся, гэта старажытная сумесь беларускіх, украінскіх і рускіх кулінарных традыцый, распавядае суразмоўнік.

— Дранікі, падсмажанкі, розныя віды мачанак да бліноў і дранікаў, варэнікі — яны ў нас пакуль чатырох відаў: з вішнямі, чарніцамі, тварагом, з бульбай са скваркамі і цыбуляй. Магчыма, з'явіцца пяты від — з капустай. Асабіста я, дарэчы, варэнікі з капустай люблю больш за ўсё. У нас у меню ёсць і «міжнародныя» фрыкюрныя стравы, звыклыя для сучаснага гараджаніна (тая ж бульба фры). Але — мне прыемна тое адзначыць — абсалютная большасць нашых гасцей аддае перавагу хатняй беларускай ежы.

Існуе стэрэатып, што кухня не ўпісваецца ў сучаснае жыццё, бо яна занадта тлустая і каларыйная. Але ж нямецкая або чэшская таксама нарад ці падыдуць пад вызначэнне «дыетычная» (як, зрэшты, практычна любая аўтэнтычная еўрапейская кухня). Між тым, у іх і сёння нямала прыхільнікаў па ўсім свеце...

— Мне здаецца, смачнае заўсёды застаецца смачным. Гарадскія жыхары прыязджаюць да нас, часам здалёк, і захапляюцца тым, што ў нас захаваныя гэтыя традыцыі. Мы скараем многіх — скажу гэта без усялякай хвальбы. Ёсць у нас і пастаянныя кліенты, якія, наведваючы нацыянальны парк, ужо загадзя ведаюць, што закажуць: якія віды дранікаў, гарачага, закусак.

Беларуская кухня можа быць і высокай (праўда, старажытная шляхецкая кухня пакуль мала кім вывучаецца). Яе абавязковы атрыбут — стравы з дзічыны. На Палессі іх ствараюць па асаблівых рэцэптах.

— Гэта наш уласны каларыт. Стравы з дзічыны мы гатуем у збанках, таму што такое мяса трэба добранька пратушыць. Каб аленіна або ласяціна раставалі ў роце, на прыгатаванне мяса патрабуецца не менш за дзве гадзіны.

Любая старадаўняя кухня — сялянская або магнацкая — па вызначэнні не можа быць «фаст». Яе стравы доўга гатуюць і з толкам, смакам, не спяшаючыся ядуць — у ідэале пад павольную сяброўскую гутарку, адзначае суразмоўнік.

Дарэчы, у «Хаце палешука» можна пакаштаваць і такую экзотыку, як мяса зубра.

— Гатаваць гэтае мяса трэба гадзіны тры. І, вядома, тут надзвычай важныя правільныя прыправы. Мы выкарыстоўваем традыцыйныя для рэгіёна спецыі: каляндру, кроп, молаты перац і г. д. Змяльчаем у кавамолцы, складаем з іх аўтарскія сумесі.

Такую страву не атрымаецца змалаціць, утаропіўшыся ў экран смартфона і не заўважаючы, што менавіта ты ясі. «Хуткая ежа» — гэта, вядома, у сучасным рытме, але колькі хвароб справакавала такая непавага да страўніка! Адвыкнуўшы гатаваць дома (максімум — што-небудзь «на хуткую руку»), многія сучасныя людзі страцілі сувязь з тым, што яны ядуць. Гамбургер або пакецік бульбы фры з'ядаецца хутка, і смак іх проста не заўважаецца, які ў гэтага «чагосьці» быў...

— У Мінску знайсці добры рэстаран з хатняй кухняй вельмі складана — не раз пра тое распавядалі нашы госці-мінчане, — кажа Андрэй. І дадае, што 20 жніўня ў аграгарадку Ляскавічы — адміністрацыйным цэнтры Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» — адкрыецца VII Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся». А значыць, у «Хаце палешука» будзе шмат гасцей.

— І гэта натхняе. Я рады, што людзі едуць да нас і застаюцца задаволеныя. Даводзілася чуць ад кліентаў: дзеля такой кухні можна прыязджаць да вас зноў і зноў.

Дранікі як шэдэўр

Дранікі ў «Хаце палешука» — абсалютны хіт, лідар па запатрабаванасці.

— Часцей за ўсё нашы госці заказваюць менавіта іх. Можа, таму, што гэта не толькі наша нацыянальная страва, а ў першую чаргу вясковая. І так, як на перыферыі, іх не прыгатуюць вам нідзе. Калі прыязджаюць госці з Мінска, здзіўляюцца: «Ого, тут сапраўдныя дранікі!». Справа ў тым, што ў гарадах вельмі папулярна выкарыстоўваць паўфабрыкаты. А мы дзяром на тарцы бульбу ўручную, дадаём яйка, цыбульку, часначок, лыжку мукі, замешваем і атрымліваем хрусткія румяныя дранікі, як у дзяцінстве, у бабулі на канікулах. І проста з патэльні — падаём. Таму што калі дранікі пастаяць, яны становяцца мяккімі, знікае скарыначка. За кошт такой тэхналогіі дранікі карыстаюцца попытам не толькі ў беларусаў, але і ў наведвальнікаў з іншых краін. Госці здалёк яшчэ любяць каштаваць стравы з мясцовай рыбы. У нас вялікае рыбнае меню — шчупак, сом, судак... Вось судак пад гароднінай — мабыць, другая страва пасля дранікаў.

Стравы з бульбы (уявіце сабе) патрабуюць сур'ёзнага кухарскага майстэрства. Дасведчаныя кухары сцвярджаюць: складаней за ўсё гатаваць кожны раз смачна просты і знаёмы з дзяцінства прадукт. У карыфеяў ёсць нават своеасаблівы тэст для маладых кухараў — ім даручаецца прыгатаваць правільнае бульбяное пюрэ, каб было без камячкоў, патрэбнай кансістэнцыі і раставала ў роце. Справіўся — значыць, ёсць тэхніка і разуменне.

Зрэшты, палескія рэцэпты знаёмых кожнаму беларусу страў нават ці можна назваць простымі — і з калдунамі, і з бабкай прыйдзецца павазіцца.

— На калдуны бульбяная маса адціскаецца праз сіта, дадаецца яйка, соль, мука і фарміруюцца ўласна калдуны з пэўным чынам падрыхтаваным фаршам унутры (тут уся справа ў правільных спецыях). Потым калдуны ўкладваюцца пластамі ў чыгунок (кожны пласт перакладаецца смажанінай з цыбулі і сала) і тушацца. У ідэале — у печы (яна дадае смак дымку). Але можна і ў духоўцы — усе роўна будзе смачна.

У чыгунку ў «Хаце палешука» гатуюць і бульбяную бабку — змазаная смятанай, яна тушыцца ў духоўцы пры 180 градусах цэлую гадзіну.

